

Не памыліцца з выбарам прафесіі — задача нумар адзін для выпускніка. А для студэнта — знайсці работу яшчэ падчас вучобы. Сярод студэнтаў БДУІР да 90% пяцікурснікаў ужо працуюць па спецыяльнасці. СТАР. 3



Дзіцячыя перадачы можна пералічыць на пальцах. Пры гэтым у Беларусі ёсць тэлестудыя, якая стварае якаснае відэа для іх. Рэклама ўнутры дзіцячых праграм забаронена, таму праекты не прыбытковыя. СТАР. 4



Углыб, у раёны, аграгарадкі... Вырашыў чалавек, які сам бачыў лепшыя сцэны Еўропы, дзе выступаў, перамагаў у конкурсах. Аркестр — беларускі, значыць, пра яго павінны ведаць ва ўсёй нашай краіне. СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

6 ЛІПЕНЯ 2013 г. СУБОТА № 123 (27488) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НАДЗЕЯ КАТКАВЕЦ НАЗНАЧАНА НАМЕСНІКАМ КІРАЎНІКА СПРАЎ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ

**Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 5 ліпеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка таксама падпісаў указ аб вызваленні Іосіфа Роліча ад пасады намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сувязі з пераходам на іншую работу.

## НАБЛІЗІЦЦА ДА СВЯШЧЭННАЙ ЗАСТУПНІЦЫ

**Вернікам Рымска-каталіцкай царквы**

*Паважаныя суайчыннікі!*

*Віншую вас і шматлікіх гасцей Беларусі з 400-годдзем прыбыцця цудатворнай іконы Маці Божай у Будслаў.*

*Рымска-каталіцкая царква за час існавання на беларускай зямлі аказала значны ўплыў на адметнасць культуры і гістарычнага лёсу нашага народа. Сапраўдным сімвалам непахіснасці веры і адданасці людзей традыцыям хрысціянства стаў нацыянальны санктуарый Маці Божай Будслаўскай.*

*Штогод у Будслаў сцякаюцца дзясяткі тысяч паломнікаў, каб наблізіцца да свяшчэннай заступніцы Беларусі, атрымаць ад Маці Божай духоўную падтрымку. Яна нясе спрадвечную праўду дабра, міласэрнасці і любові, дапамагае аб'ядноўваць прадстаўнікоў розных пакаленняў, моладзь і сталых, будучыню і мінулае, наватарства і традыцыю, каб узбагачаць новым зместам сучаснасць.*

*Урачыстасці ў гэтым блаславёным месцы напаўняюць сэрцы гонарам і радасцю за нашу краіну. Няхай веліч і значнасць свята адчуваюць новыя пакаленні вернікаў і праз стагоддзі гучыць у Будславе малітва за Беларусь, за яе народ.*

*Шчыра зычу ўсім вам здароўя, шчасця, дабрабыту і плёну ва ўсіх справах.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ОЙ, КУПАЛЛЕ, ТЫ ХУТЧЭЙ, ХУТЧЭЙ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Студэнткі 3-га курса кафедры этналогіі і фальклору Юлія Лянoненка і Кацярына Асадчая частыя ўдзельніцы народных традыцыйных святаў. Сярод гэтых святаў асаблівае — Купалле.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль РУБІНАЎ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

***«Роля мясцовых Саветаў дэпутатаў у сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёнаў вялікая, але яе неабходна ўмацоўваць. Нам трэба яшчэ раз звярнуць увагу на органы мясцовага самакіравання, актывізаваць іх дзейнасць, таму што менавіта яны бліжэй за ўсё да людзей і ад работы, якую яны праводзяць, напрамую залежаць якасць і ўмовы жыцця насельніцтва».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.07.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8840,00 | ▲ |
| Еўра | 11400,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 266,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1083,33 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 28° |
| Віцебск | + 29° |
| Гомель | + 33° |
| Гродна | + 27° |
| Магілёў | + 28° |
| Мінск | + 29° |

**Сяргей МАСКЕВІЧ:**

# «ВЫРАШАЛЬНАЕ ЗНАЧЭННЕ МАЕ НЕ НАВУЧАННЕ Ў ПРЭСТЫЖНАЙ ГІМНАЗІІ, А АСОБА НАСТАЎНІКА»

**Дзесяць вучняў у класе — гэта многа ці мала? А калі ў класе навучаюцца ўсяго два —тры ці пяць дзяцей? І колькі ўвогуле вучняў павінна быць у 10-х і 11-х класах, каб старшую ступень школы можна было захаваць? Адназначнага адказу на гэтыя пытанні не можа быць, бо ў кожнага зацікаўленага боку — свая праўда. Для бацькоў школьнікаў невялікая напаўняльнасць класа — гэта, хутчэй, вялікі плюс, бо, калі ўсе дзеці ў педагога навідавоку, можна спадзявацца на індывідуальны падыход. Да таго ж у малакамплектнай школе звычайна пануе амаль сямейная атмасфера. І за падвоз дзяцей у суседнюю вёску не трэба хвалявацца...**

**Ёсць клас, ёсць вучні — ёсць нагрузка ў школьнага педагога. А калі клас расфарміроўваецца, а школа закрываецца, настаўнікі трапляюць пад скарачэнне. Між іншым, вырашаць пытанне з працаўладкаваннем педагогаў ліквідаваных школ становіцца ўсё больш праблематычна. На 1 верасня 2012 года ў краіне былі закрыты і рэарганізаваны 202 установы адукацыі. Да новага навучальнага года плануецца закрыць яшчэ 109 школ і 121 рэарганізаваць са змяненнем іх статусу.**

**З іншага боку, ёсць меркаванне, што з пункту гледжання эканамічнай эфектыўнасці сістэма адукацыі не вытрымлівае ніякай крытыкі. Колькасць занятых у сістэме адукацыі трэба змяншаць, а напаўняльнасць класаў — павялічваць. Пра тое, наколькі ўсё ж такі правільна кіравацца эканамічнай эфектыўнасцю, калі размова ідзе пра інтарэсы дзяцей, мы гутарым з міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргеем МАСКЕВІЧАМ.**

***— Сяргей Аляксандравіч, новыя падыходы, прапанаваныя Міністэрствам адукацыі па змяненні напаўняльнасці класаў у бок павелічэння колькасці дзяцей, выклікалі заклапочанасць як у адміністрацыі ўстаноў адукацыі, прафсаюзных арганізацый, так і ў педагогаў і бацькоўскай грамадскасці...***

— Прывяду толькі некалькі фактаў для роздуму. У савецкія часы на аднаго настаўніка прыпадала 10 вучняў, а ў нас сёння на аднаго настаўніка прыпадае 8,4 вучня. Для параўнання: у Літве — 12 вучняў, а ў Германіі — 14! Чаму, калі змяншаецца колькасць навучэнцаў і студэнтаў, колькасць педагогаў у краіне павінна заставацца ранейшай? Ёсць вялікі рэзерв для



павелічэння напаўняльнасці класаў у гарадскіх школах. . У мінулым навучальным годзе ў Беларусі налічвалася 200 устаноў з колькасцю менш чым 25 навучэнцаў і былі адкрыты 392 класы (!) з адным навучэнцам. Якая, скажыце, у гэтым была патрэба? Мясцовымі органамі ўлады праводзіцца работа па аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, але ў той жа час суадносіны колькасці настаўнікаў да колькасці навучэнцаў практычна не змяняюцца.

У сярэднім утрыманне аднаго вучня ў школе абыходзіцца дзяржаве ў 11 мільёнаў рублёў. Але ў нас ёсць школы, дзе выдаткі на вучня дасягаюць і 60, і 80 мільёнаў рублёў. Гэта «залатыя дзеці», у прамым сэнсе слова... У Брэсцкай вобласці, напрыклад, незалежна ад таго, колькі ў класе навучэнцаў, выдаткі мясцовага бюджэту на адзін класа-камплект складаюць у 2013 годзе 220 мільёнаў рублёў. І калі ў класе ўсяго адзін ці некалькі вучняў — гэта яшчэ не зусім гарантуе, што дзеці дасягнуць у вучобе асаблівых поспехаў. Таму што, па-першае, выніковасць навучання залежыць ад прафесійнага ўзроўню як кожнага канкрэтнага педагога, так і ўвогуле педагагічнага калектыву, і, як бы гэта празаічна ні гучала, ад матэрыяльна-тэхнічнай базы школы: наяўнасці адпаведнага вучэбнага абсталявання, магчымасці выкарыстоўваць інфармацыйна-камунікатыўныя рэсурсы і гэтак далей. СТАР. 2

# ПАКУЛЬ ЛЯСЫ НЕ РАДУЮЦЬ УРАДЖАЕМ...

**Сёння спажывецкай кааперацыяй ужо закуплена 250 тон чарніц, і гэта значна менш, чым летась: выявіліся неспрыяльныя ўмовы надвор'я. Ад надвор'я цалкам залежаць і цэны на лісічкі, якія цяпер складаюць 30—35 тысяч рублёў за кілаграм. «Гэта даволі высокая цана, бо грыбоў пакуль вельмі мала», — адзначыла начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Таццяна Кірпічэнка.**

Зараз Белкаапсаюз закуплівае гародніну, асабліва актыўна гэты працэс ідзе ў Брэсцкай вобласці. На сёння цэны на агуркі ў Століне складаюць 4,5 — 5,5 тысячы рублёў за кілаграм, на капусту — 2—2,5 тысячы, на таматы — ад 8 да 10 тысяч рублёў. Парэчкі прымаюць па 5—6 тысяч, маліны па 7—8 тысяч, вішні — ад 5 да 10 тысяч рублёў за кілаграм.

Па словах Таццяны Кірпічэнкі, сёлета ўжо заключана каля 13 тысяч дагавораў на закупку 23 тысяч тон сельгаспрадукцыі.

«У гэтым годзе мы арганізавалі закупку больш за 400 тон цыбулі-сяўка, каля 370 тон насеннай бульбы, насення гароднінных культур — на суму больш за 10 млрд рублёў», — паведаміла Таццяна Кірпічэнка.

**Для закупак прадукцыі ў насельніцтва стацыянарна па краіне працуе каля 600 прыёма-нарыхтоўчых пунктаў,** у разгар сезона амаль у кожным раёне адкрываюцца яшчэ 3 — 5 дадатковых часовых пунктаў.

Таццяна Кірпічэнка, вызначаючы наперад пытанні журналістаў, зазначыла, што разлік з насельніцтвам праводзіцца ў момант здачы прадукцыі. «Запазычанасцяў перад здатчыкамі ў нас няма», — падкрэсліла яна.

Акрамя таго, начальнік упраўлення нарыхтовак акрэсліла пытанне цэнаўтварэння. Яна расказала, што спажыўкааперацыя не з'яўляецца манапалістам на рынку нарыхтовак, і цэны тут дыктуюць прадпрыемствы-перапрацоўшчыкі. На аснове гэтых цэнаў Белкаапсаюз усталёўвае закупачныя цэны для насельніцтва.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сёлета на клубніцы былі ўстаноўлены наступныя цэны: для вытворчасці віна — 2 тысячы, для кансервавання — 3 тысячы рублёў. На таварныя клубніцы ў гэтым сезоне цэны маглі мяняцца на працягу дня ў залежнасці ад попыту і прапановы, а таксама ўмоў надвор'я; у сярэднім яны склалі 10—12 тысяч рублёў за кілаграм.

Цэны на раслінную прадукцыю дзікарослага паходжання фарміруюцца не на ўнутраным рынку, а на еўрапейскім, бо ў асноўным яна ідзе на экспарт. У Літву, Польшчу, Германію пастаўляюцца чарніцы, цяперашні кошт на іх складае 12—15 тысяч рублёў, але гэтыя лічбы адрозніваюцца па рэгіёнах.

Па апошняй аператыўнай інфармацыі, Белкаапсаюз закупіў у насельніцтва каля 13 тысяч тон гародніны, павялічыўшы лічбу нарыхтовак у 1,9 раза ў параўнанні з мінулым годам. У тым ліку агуркоў нарыхтавана 3,5 тысячы тон, таматаў — 780 тон, капусты — 5,2 тысячы тон (з іх ранняй — 1,6 тысячы тон). Бульбы сёлета закупілі 7,8 тысячы тон, гэта ў 8 разоў больш, чым у мінулым годзе. Садавіны — 5 тысяч тон, і гэта ў 1,5 раза больш, чым летась. Увогуле за ўсю пералічаную сельгаспрадукцыю за шэсць месяцаў насельніцтву выплачана больш за 600 млрд рублёў.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

■ Актуальна

## У «ЖЫРОЎКАХ» З'ЯВІЦЦА РАСШЫФРОЎКА ТЭХАБСЛУГОЎВАННЯ

**Пра гэта заявіў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ШОРАЦ.**

— У жыроўцы, якую вы атрымліваеце зараз, вы бачыце расшыфроўку канкрэтна па сваёй кватэры, — сказаў Андрэй Шорац. — Але мы ўжо ўзгаднілі форму жыроўкі і разглядаем пытанне аб размяшчэнні ў ёй паказанняў групавых прыбораў уліку цяпла і вады кожнага канкрэтнага дома і звестак пра тыя работы па бягучым рамонце, якія былі зроблены ў канкрэтным доме, а таксама іх кошт. Гэтае новаўвядзенне прадугледжвае пераробку вялікага комплексу праграмнага забеспячэння. Усе неабходныя моманты адпрацоўваюцца, і, думаю, у бліжэйшы час мы на пяройдзем на новую форму. Засталося толькі прайсці некалькі бюракратычных працэдур.

**Святлана БУСЬКО.**

## СКАРПІЁН З ГВАЗДЗІКОМ

**Нацыянальны банк Беларусі ўвёў у абарачэнне тры сярэбраныя памятныя манеты, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.**

Дзве — «Шалі. 2013 (Libra. 2013)» і «Скарпіён. 2013 (Scorpio. 2013)» серыі «Знакі задыяка. 2013» — наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925 з пакрыццём золатам пробы 999,9, масай 28,28 грама, дыяметрам 41 міліметр. Манеты адчаканены на Манетным двары Польшчы якасцю «пруф» з пазалотай, тыражом да 10000 штук кожная.

Трэцяя — «Гваздзік (Dianthus)» серыі «Прыгажосць кветак» наміналам 10 рублёў, пробай сплаву 925, масай 14,14 грама, дыяметрам 32 міліметры. Адчаканена на тым жа манетным двары якасцю «пруф», тыражом да 8000 штук.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ФРАНЦЫЯ ТАКСАМА СОЧЫЦЬ ЗА ГРАМАДЗЯНАМІ

**Як паведамляюць інфармагенцтвы, стала вядома, што французскія разведвальныя службы праслухоўваюць тэлефонныя размовы, сочаць за перапіскай і любой іншай актыўнасцю сваіх грамадзян у сеціве.**

Паведамляецца, што гэта неабходна для бяспекі насельніцтва — з дапамогай сачэння спецслужбам прасцей выявіць розныя тэрарыстычныя арганізацыі. Уся гэтая сістэма можа параўнацца з амерыканскай праграмай PRISM. Акрамя таго, разведка адсочвае патокі інфармацыі праз серверы кампаній Google, Facebook, Microsoft, Apple, Yahoo!. Усе гэтыя звесткі збіраюцца ў гіганцкім супер-камп'ютары. Інфармацыяй з гэтай базы карыстаюцца следчыя, якія кажуць, што атрымалі наводкі з нейкіх «ананімных крыніц». Французскія афіцыйныя асобы пакуль ніяк не каментавалі гэтую інфармацыю.

Між тым урад краіны рэзка крытыкаваў дзеянні разведвальных агенцтваў ЗША, якія, мяркуючы па ўцечцы сакрэтнай дакументацыі, шпіёнілі за дыпламатамі ў прадстаўніцтвах Еўрасаюза ў Вашынгтоне і Нью-Ёрку. Маштабы аперацыі сталі вядомыя дзякуючы выкрыццю экс-агента ЦРУ Эдварда Сноўдэна.

### ГОЛАД НАСТУПІЦЬ У 2050 ГОДЗЕ



**Паводле даследаванняў навукоўцаў, ужо у 2050 годзе насельніцтва Зямлі дасягне паказчыка ў 9,6 млрд чалавек, што перавышае сітуацыю, якая склалася на сённяшні дзень, на 2,6 мільярда. Пры гэтым ужо цяпер расце сярэдні клас у Кітаі і Індыі, які спажывае значна больш мяса, чым калі-небудзь раней.**

Для таго, каб у сваёй недалёкай будучыні чалавецтва не сутыкнулася з дэфіцытам прадуктаў харчавання, ужо цяпер неабходна павялічыць як мінімум у два разы вытворчасць збожжавых культур, аднак 40 гадоў, якія засталіся для гэтага, відавочна недастаткова, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на крыніцу ва Універсітэце Мінесоты.

Адзначаецца таксама, што прырост насельніцтва прыпадае на нязручны час — перыяд глабальнага пацяплення. Каб справіцца з харчовай сітуацыяй, неабходна ўсё больш пасяўных плошчаў, аднак пры гэтым катэгарычна нельга высякаць лясы пад новыя сельгасучасткі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ДЫНАЗАЎРЫ ВЫМЕРЛІ З-ЗА МАТЫЛЬКОЎ?

**Нечаканую версію прычыны гібелі дыназаўраў прапанаваў палеантолаг Браян Світэк. Як піша ён у сваёй кнізе, 66—65 мільёнаў гадоў таму наша планета была падобная да велізарнага квітнеючага саду.**

У тую пару птушак яшчэ не было, і матылькі адчувалі сябе выдатна, хутка пладзіліся. Цалкам верагодна, адзначае Світэк, прычынай гібелі дыназаўраў стаў голад. Матылькі, як і дыназаўры, былі вегетарыянцамі. У вялізных рэптылій, праўда, былі вялізныя сківіцы, але лускакрылыя маглі разлічваць на непераможную зброю: колькасць. Вусені жэрлі лісце, і дыназаўры, верагодна, вымiралі ад спазмаў у страўніку. Новая тэорыя пра матылькоў-забойцаў выклікае ўсмешку, як і многія да яе падобныя.

Аднак самай папулярнай застаецца тэорыя аб тым, што занадта актыўныя ў той час вулканы напоўнілі атмасферу попелам, што прывяло да тэмпературных змен і змены ўзроўню Сусветнага акіяна.



Менавіта ў гэты момант, калі папуляцыя ўжо перажывала цяжкасці, прыляцеў Юкатанскі метэарыт, і гэта стала апошнім ударам.

КОРАТКА

Не пераадолелі парог 20 балаў, устаноўлены Міністэрствам адукацыі, 14,07 працэнта абітурыентаў з 1 720 удзельнікаў іспыту па геаграфіі.

У Дзень сям'і, любові і вернасці (8 ліпеня) у Гродне запрашаюць пакланіцца іконе заступнікаў шлюбу. Абраз з мошчамі святых дабраверных князёў Пятра і Фяўронні Мурамскіх захоўваецца ў манастыры як дар Свята-Троіцкага Мурамскага манастыра. Абраз будзе даступны для пакланення ў галоўным храме манастыра з 8.00 да 21.00.

Цалкам адкрыты рух на транспартнай развязцы на скрыжаванні вуліц Ціміразева і Арлоўскай у Мінску.

Супрацоўнікі Ашмянскай мытні затрымалі 15 тыс. пар кантрабандных імпартных шкарпэтак фірмы Nike. Папярэдне шкарпэткавыя вырабы ацэненыя на суму звыш Br647 млн.

# «АДДАЦЬ ШВАРТОВЫ!»

## Карэспандэнты «Звязды» выйшлі ў рэйд разам з воднымі ратаўнікамі

**Таварыства ратавання на водах мае доўгую і вельмі няпростую гісторыю. Адлік яе вядзецца з 1872 года, калі па ініцыятыве маракоў з Кранштата быў створаны першы правобраз арганізацыі. Яна перажыла дзве рэвалюцыі, некалькі войнаў, расфарміраванне і эканамічны катаклізм пачатку 1990-х. Зараз жа беларускае таварыства складаецца з 66 выратавальных станцый і 89 пастоў. Працуюць у ім паўтары тысячы прафесіяналаў ратавальнай справы. У межах сталіцы бела-блакітны сцяг таварыства ратавання на водах лунае ў трох месцах. Яны размешчаны на Камсамольскім возеры і двух вадасховішчах — Драздах і Цнянскім. У Цнянку з іх і завіталі карэспандэнты «Звязды».**

Выратавальная станцыя Цнянская знешне зусім непрыкметная. Сіні вагончык схаваўся за старымі раскідзістымі дрэвамі. Тое, што тут нясуць вахту ратаўнікі, хутчэй падкажуць прычал і два катары.

— Перыметр Цнянскага вадасховішча дасягае ажно адзінаццаці кіламетраў! А пляжаў на ім толькі два кіламетры. І наша задача — каб усе людзі, якія прыйшлі адпачываць, вярнуліся дахаты, — гаворыць начальнік станцыі Георгій Жаброўскі. — Гэта толькі ў кінастужках чалавек, тонучы, крычыць, кліча на дапамогу. У рэальнасці ж усё наадварот. Чалавек, які тоне, паводзіць сябе вельмі ціха. Каб удыхнуць паветра, у яго з-за неспадзяванасці ёсць толькі долі секунды. З гэтай прычыны крыкнуць ён проста не паспее: вада трапіць у лёгкія. З гэтага моманту лічыльнік запушчаны: каб выжыць, у небаракі ёсць толькі лічаныя хвіліны. СТАР. 6



Фота Надзеі БУЖАН.

Кожныя паўгадзіны дзяжурная змена выходзіць на агляд ахоўных зон.

## РЭЗАЛЮЦЫЮ АДЗІНАГАЛОСНА ЗАЦВЕРДЗІЛІ Ў АБСЕ

**Парламенцкая дэлегацыя Беларусі пад кіраўніцтвам намесніка Старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктара Гумінскага завяршыла работу на 22-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. У выніковую Стамбульскую дэкларацыю, прынятую 3 ліпеня, разам з іншымі ўвайшла і рэзалюцыя «Супрацоўніцтва ў мэтах пераходу да «зялёнай» эканомікі ў кантэксце ўстойлівага развіцця», якую падрыхтавалі беларускія парламентарыі.**

Гэтая рэзалюцыя была адзінагалосна прынята на пасяджэнні Агульнага камітэта Парламенцкай асамблеі АБСЕ па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі. Рэзалюцыя прадугледжвае такія мерапрыемствы, як памяншэнне колькасці шкодных выкідаў у атмасферу, эканомнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў і іншыя. Галоўная яе мэта — спрыяць эканамічнаму развіццю краін без урону для навакольнага асяроддзя, выкарыстанню аднаўляльных крыніц энергіі, стварэнню чыстых тэхналогій і вытворчасцяў.

**Праслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

■ Курсавая розніца

## ВЫЖЫВЕ ТОЙ, У КАГО БОЛЬШ ШАНЦАЎ?

**Назіраць за тым, як спаборнічаюць паміж сабою еўра і долар, становіцца ўсё цікавей. Мне ўсё гэта пачынае нагадваць сітуацыю з ваеннымі санітарамі: яны павінны хутка вызначыць, хто з параненых мае больш шанцаў на выжыванне, і выцягнуць з поля бою менавіта яго. У ролі санітараў інвестары, параненыя — асноўныя сусветныя валюты.**

Аб'яднаная Еўропа пастаянна заяўляе аб пэўных захадах па выраўноўванні сітуацыі ў эканоміцы, але яны не даюць плёну. Хаця некаторыя эксперты і сцвярджаюць, што рана ці позна гэтыя захады прывядуць да станоўчага эфекту. Са свайго боку, Амерыка канстатуе лепшую статыстыку ў параўнанні з еўрапейскай, а таму і інвестары часцей глядзяць у бок Злучаных Штатаў.

Пасля перадышкі напрыканцы мінулага тыдня, калі долар спыніў рост, а еўра — падзенне, апошнія пяць дзён паказалі трываласць ранейшай тэндэнцыі: «зялёны» зноўку вырас, а «еўрапеец» патаннеў. У параўнанні з нашай нацыянальнай валютай сітуацыя выглядае так: долар падаражэў на 50 рублёў (плюс 0,6%) да новага рэкорду ў 8840; еўра патаннеў да 11400, страціўшы яшчэ 60 рублёў (мінус 0,5%).

Паводзіны расійскага рубля таксама зараз малапрадказальныя. У асноўным залежачы ад цаны на нафту, ён вагаецца — то расце, то падае. На гэтым тыдні зноў упаў: на 2,5 рубля (мінус 0,9%) да 266.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■

# «ВЫРАШАЛЬНАЕ ЗНАЧЭННЕ МАЕ НЕ НАВУЧАННЕ Ў ПРЭСТЫЖНАЙ ГІМНАЗІІ, А АСОБА НАСТАЎНІКА»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Па-другое, не меншае значэнне мае стварэнне ў класе канкурэнтнага асяроддзя, матываванасць на вучобу і поспех саміх дзяцей. А калі ў класе ўсяго пяць вучняў, то, як правіла, адзін з іх будзе паспяховым, два — «сераднячкамі», і яшчэ два, як мінімум, будуць усім перашкаджаць. Наяўнасць дзіцячага калектыву, грамадскай арганізацыі, удзел у грамадскім жыцці школы — усё гэта абавязковыя складнікі паспяховай сацыялізацыі навучэнцаў. Таму, калі мы закрываем малакамплектныя школы, робіцца гэта з улікам інтарэсаў дзяцей. Галоўнае, каб умовы для навучання і развіцця дзяцей былі значна лепшыя, чым у закрытай школе.

Да таго ж рашэнне аб закрыцці абавязкова прымаецца з улікам аналізу дэмаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне. І калі відавочна, што ў бліжэйшыя гады дзеці будуць папаўняць навучальную ўстанову, ніхто згоды на яе закрыццё не дасць. Працэс рэструктурызацыі заўсёды вымагае прадуманых і ўзважаных рашэнняў. І тут трэба думаць як пра інтарэсы дзяцей, так і пра тое, як і дзе будуць працаўладкаваны педагогі.

Што датычыцца павышэння напаўняльнасці класаў у гарадскіх школах і гімназіях, то гэта мера закране толькі першыя, пятыя і дзясятыя класы. Мы арыентуем мясцовыя органы кіравання адукацыі на 24 вучні ў класе.

### ГІМНАЗІЯ ЦІ ШКОЛА?

***— Зараз у Беларусі праходзіць маніторынг правапрымяняльнай практыкі Кодэкса аб адукацыі. На сустрэчы парламентарыяў і педагагічнай грамадскасці разглядалася шмат прапаноў па карэкціроўцы Кодэкса. У прыватнасці, агучвалася ідэя аб увядзенні ніжняй прахадной планкі пры паступленні ў гімназіі, бо практычна ў кожнай трэцяй такой навучальнай установе конкурсу летась амаль не было.***

— Я асабіста супраць увядзення нейкіх дадатковых бар'ераў для будучых гімназістаў, але справа ў іншым. Лічу падзел устаноў агульнай сярэдняй адукацыі на школы і гімназіі часовай з'явай. Сёння ў гімназіях ствараюцца ўмовы для навучання і развіцця дзяцей з высокімі патэнцыяльнымі магчымасцямі і здольнасцямі, дзяцей, схільных да творчай і даследчай дзейнасці. Але, пагадзіцеся, што навучаць дзяцей без уліку іх індывідуальных патрэб, здольнасцяў і запытаў ужо немагчыма ў прынцыпе. Прычым не толькі ў гімназіях, але і ў школах. У кожнага дзіцяці ёсць талент і здольнасці, якія трэба раскрыць. У гэтым і заключаецца задача педагога.

Хачу заўважыць, што ў сярэдніх школах, гімназіях і ліцэях выкарыстоўваюцца адны і тыя ж вучэбныя праграмы. Гэта значыць, што вучэбныя праграмы для вывучэння прадметаў на базавым і павышаным узроўні не адрозніваюцца адна ад адной. Але, у адрозненне ад сярэдніх школ, у гімназіях і ліцэях ёсць магчымасць за кошт большай колькасці гадзін на вывучэнне асобных (профільных) прадметаў, прадугледжанай вучэбнымі планамі, адпрацоўваць уменні і навыкі, на якія ў сярэдняй школе не хапае часу. Дарэчы, з наступнага навучальнага года мы прадастаўляем магчымасць кіраўнікам школ арганізоўваць на старшай ступені школы вывучэнне тых ці іншых прадметаў на павышаным узроўні шляхам пераводу факультатыўных гадзін у вучэбныя. Размова не ідзе пра тое, што з 1 верасня абсалютна ўсе школы пачнуць укараняць ідэю прафілізацыі. Для арганізацыі адукацыйнага працэсу з вывучэннем прадметаў на павышаным узроўні павінен выконвацца шэраг умоў. Па-першае, абавязкова павінна прысутнічаць гатоўнасць і зацікаўленасць у гэтым вучняў і іх бацькоў. Па-другое, «паглыбленне» ў навучанні немагчыма без прысутнасці ў школе высокакваліфікаваных педагагічных кадраў. Пад увагу таксама будзе брацца і матэрыяльна-тэхнічная база школы: ці дазваляе яна ў поўным аб'ёме рэалізаваць змест вучэбнай праграмы на павышаным узроўні? Прызнаюся, што ў першую чаргу мы зацікаўлены ў стварэнні фізіка-матэматычных класаў, паколькі нас хвалюе стан з засваеннем школьнікамі дакладных дысцыплін.

**«Працэс рэструктурызацыі заўсёды вымагае прадуманых і ўзважаных рашэнняў. І тут трэба думаць як пра інтарэсы дзяцей, так і пра тое, як і дзе будуць працаўладкаваны педагогі»**

Увогуле я перакананы ў тым, што для поспеху вырашальнае значэнне мае не столькі навучанне ў прэстыжнай гімназіі, колькі асоба настаўніка. Толькі адораныя настаўнікі, захопленыя сваім прадметам, могуць павесці дзіця за сабой, дапамогуць вучню разабрацца ва ўсіх нюансах і зразумець «музыку» таго ці іншага прадмета.

***— А як, цікава, вы ставіцеся да зніжэння ўзросту, з якога будзе дазволена прымяняць да навучэнца дысцыплінарнае спагнанне? Сёння гэта 14 гадоў. Працытую аднаго з дырэктараў школ: «Да таго ж трэба спрацыць і саму працэдуру аб'яўлення заўвагі, бо сёння, калі кіравацца нормамі Кодэкса, прасцей зняць дырэктара школы з работы, чым аб'явіць вучню заўвагу...»***

— Дырэктар гэтай школы — разумны чалавек, і як я магу з ім не пагадзіцца? Увогуле стаўленне бацькоў і дзяцей да школы, як да нейкай «камеры захоўвання», трэба карэнным чынам змяняць. Маўляў, аддаў дзіця і зняў з сябе адказнасць, а далей усё — праблемы толькі школы. У кожнага, у рэшце рэшт, павінны быць свае абавязкі: абавязак дзяржавы — стварыць умовы для атрымання адукацыі, а абавязак вучня — скарыстацца дадзенай яму магчымасцю. Настаўнік павінен вучыць, а школьнік павінен вучыцца. І ў старшыя класы павінны прыходзіць толькі тыя вучні, якія не проста жадаюць, але і могуць засвойваць вучэбную праграму. У рэшце рэшт, у нас у краіне абавязковая толькі дзевяцігадовая базавая адукацыя.

### ВЫХАВАННЕ Ў САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТКАХ

***— Ёсць таксама прапанова занатаваць у Кодэксе забарону на прыцягненне педагогаў да дзейнасці, якая не прадугледжана службовай інструкцыяй. Вы асабіста яе падтрымліваеце? Ці можна ўвогуле прапісаць усе абавязкі педагога ў службовай інструкцыі?***

— Немагчыма. Вядома, выконваць неўласцівыя ім функцыі педагогі не павінны. Але я не падзяляю думку, што задача школы заключаецца толькі ў аказанні вучням адукацыйных паслуг. Настаўнік павінен быць для сваіх вучняў і выхавальнікам, і псіхолагам, і сацыяльным педагогам. Ён павінен ведаць усё пра жыццё дзяцей не толькі ў школе. А гэта немагчыма без жывых зносін з вучнямі і іх бацькамі. На маю думку, сучасны педагог таксама павінен прыняць новую форму камунікацыйных зносін, знайсці сваю нішу ў сацыяльных сетках і ўмела ёй карыстацца для ажыццяўлення выхаваўчага працэсу і ўзаемадзеяння з сям'ёй праз вядзенне форумаў і блогаў. Сучасны педагог павінен быць сучасным і мабільным, як сённяшнія дзеці.

***— Наколькі я ведаю, вы нядаўна наведвалі Фінляндыю. Школьнікі з гэтай краіны традыцыйна ўзначальваюць рэйтынгі па выніках міжнародных даследаванняў PISA і TIMS. А работа педагога ў Фінляндыі лічыцца прэстыжнай і паважанай. І мужчын сярод педагогаў ці не палова... У чым сакрэт?***

— Інтарэс да адукацыі ў Фінляндыі вельмі высокі. І давер да школы таксама высокі. Гэты інстытут карыстаецца падтрымкай у грамадстве, і на адукацыю ў Фінляндыі выдзяляецца 7% валавага ўнутранага прадукту. Фінляндыя — адна з нешматлікіх еўрапейскіх краін, дзе моладзь ахвотна ідзе ў педагогіку. Работа педагога — гэта стабільнасць і гарантаваны заробак. Не самы высокі, але ў гэтай краіне ўвогуле роскід у аплаце работнікаў розных сфер складае ўсяго 50%.

Натуральна, што далёка не кожны ахвотны можа быць педагогам. У Фінляндыі пры адборы будучых спецыялістаў звяртаюць увагу не толькі на акадэмічную паспяховасць прэтэндэнтаў, але і на іх маральна-псіхалагічныя якасці, без якіх нельга стаць сапраўдным педагогам. Перад прыняццем ва ўніверсітэт усе будучыя педагогі праходзяць спецыяльную гутарку, падчас якой выкладчыкі спрабуюць высветліць, як чалавек будзе весці сябе ў той ці іншай сітуацыі, як ён будзе рэагаваць на магчымую крытыку з боку навучэнцаў ці іх бацькоў, як будзе паводзіць сябе з так званымі «цяжкімі» вучнямі. У школы выпускнікі таксама трапляюць на конкурснай аснове. Але калі ты прайшоў конкурс, можна не хвалявацца за сваю будучыню — інтэлігентная работа табе забяспечана.

А мы лічым, што кожны, хто закончыў навучанне па педагагічнай спецыяльнасці, павінен прыйсці ў школу працаваць. Больш за тое, яшчэ думаем, што зрабіць, каб малады спецыяліст праз два гады не збег. Мяркую, трэба, каб на рынку працы быў конкурс. І ўвогуле, на жаль, не кожнага выпускніка можна дапускаць да дзяцей.

***— А наколькі шырокае кола абавязкаў у фінскіх педагогаў?***

— Такую моцную выхаваўчую ролю, як у нас, школа ў Фінляндыі не адыгрывае, і настаўнікі займаюцца там пераважна навучаннем. Але ў Фінляндыі пануе абсалютны культ вучня, у якога выключныя правы. Зрабіць заўвагу вучню і тым больш пакараць дзіця настаўнік не мае права. У Фінляндыі, напрыклад, быў выпадак, калі настаўніка звольнілі за тое, што той зрабіў заўвагу вучню на ўроку. Вучань там можа стаяць на галаве, перашкаджаць аднакласнікам, але выказаць сваю незадаволенасць настаўнік не можа. І паскардзіцца на вучня бацькам настаўнік таксама не можа. Лічыцца, што ва ўсім вінаваты педагог. Калі яго вучань не спраўляецца з вучэбнай праграмай, дрэнна сябе паводзіць, трэба шукаць да яго індывідуальны падыход, выбудоўваць для яго індывідуальную траекторыю.

**«Мы лічым, што кожны, хто закончыў навучанне па педагагічнай спецыяльнасці, павінен прыйсці ў школу працаваць. Але, на жаль, не кожнага выпускніка можна дапускаць да дзяцей»**

Настаўнік можа рэкамендаваць бацькам перайсці на праграму больш нізкага ўзроўню. Але бацькі могуць і не прыслухацца да яго меркавання... Дарэчы, у Фінляндыі доўгі час не існавала спецыяльных праграм для адораных дзяцей. Сапраўды, фінскія школьнікі дэманструюць выдатныя поспехі падчас міжнародных даследаванняў. Але і фіны сёння прыйшлі да высновы, што інтэлектуальную эліту трэба вырошчваць і выхоўваць. Кажуць, што фінаў няшмат, таму асаблівыя здольнасці патрабуюць асаблівай увагі...

### РЭПЕТЫТАРСТВА: БІЗНЕС НА ПАМКНЕННЯХ БАЦЬКОЎ?

***— Вяртаюся да беларускай рэчаіснасці... Многіх і педагогаў, і дзяцей, не зусім задавальняе арганізацыя шостага школьнага дня. Скажыце, чаму дзіця не мае магчымасці выбіраць, дзе і як яму правесці вольны час у суботу? Чаму бацькі не могуць правесці выхадны дзень з дзіцем? Навошта масава заклікаць сельскіх школьнікаў да наведвання школы ў суботу, асабліва восенню і вясной, калі дзеці дапамагаюць сваім бацькам па гаспадарцы?***

— Не буду спрачацца, што ў сельскіх школах ёсць свая спецыфіка, якую абавязкова трэба ўлічваць. Для нас галоўнае, каб дзіця было занятае справай, няважна дзе: у школе, у аб'яднаннях па інтарэсах ці на прысядзібным участку... Дзіця мае права выбіраць, дзе і як яму правесці вольны час у суботу, але яму трэба дапамагчы, захапіўшы яго цікавай дзейнасцю і стварыўшы камфортныя ўмовы для яго развіцця. Мы лічым, што шосты школьны дзень павінен быць прысвечаны пераважна заняткам фізкультурай і спортам і працоўнай дзейнасці. У сельскай школе больш лагічна будзе, напэўна, калі дзеці дапамогуць сваім бацькам па гаспадарцы. А для сталічнага рэгіёна, наадварот, актуальная «хранічная» занятасць бацькоў нават у выхадныя дні, таму там многія дзеці ў суботу прадастаўлены самі сабе.

***— Ёсць меркаванні, што аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі закране і ўстановы дадатковай адукацыі. Але ж у сельскай мясцовасці і малых гарадах гэтыя ўстановы з'яўляюцца для дзяцей фактычна адзінай магчымасцю набыць дадатковыя веды, развіць здольнасці і эстэтычны густ...***

— Мы будзем імкнуцца да таго, каб база ўстаноў дадатковай адукацыі выкарыстоўвалася з поўнай нагрузкай. У разумных межах гэтыя ўстановы будуць рэарганізоўвацца і аб'ядноўвацца. Абавязкова трэба палепшыць матэрыяльную базу аб'яднанняў, якія займаюцца тэхнічнай творчасцю дзяцей і моладзі. Мы зафіксуем выдаткі на гэтыя мэты ў параўнанні з асноўнымі адукацыйнымі праграмамі і будзем сур'ёзна кантраляваць, каб выдзелены рэсурс выкарыстоўваўся максімальна эфектыўна. Каб не было прыпісак і фальсіфікацый, калі на паперы гурток наведваюць 20 чалавек, а на самой справе — у суботу яго дзверы для дзяцей зачынены. У нас ёсць шмат цудоўных прыкладаў, калі да педагогаў дадатковай адукацыі выстройваюцца чэргі з ахвотных трапіць да іх. Але ёсць і іншыя прыклады, калі педагог атрымлівае грошы ні за што. Ключавым момантам у паспяховай дзейнасці тых ці іншых гурткоў ці спартыўных секцый з'яўляецца ўсё ж такі наяўнасць таленавітага і неардынарнага педагога.

***— Нядаўна ў Расіі правялі даследаванне, падчас якога высветлілася, што 90% выпускнікоў не разлічваюць пры здачы адзінага дзяржаўнага экзамену толькі на ўласныя сілы. Не ведаю аналагічную статыстыку ў нас. Тым не менш даводзіцца канстатаваць, што вера ў інстытут рэпетытарства набыла такія маштабы, што звяртацца да рэпетытараў бацькі пачынаюць ужо ў пачатковай школе. А як вы ставіцеся да рэпетытарства? І што параілі б бацькам: выдаткоўваць грошы на рэпетытараў ці не?***

— Да рэпетытарства я стаўлюся станоўча. І мяркую, што мае парады бацькам не патрэбны, таму што калі тыя жадаюць павысіць шанцы свайго дзіцяці на паступленне (асабліва на бюджэтнае аддзяленне), яны будуць шукаць рэпетытара. На колькі працэнтаў гэты шанц павысіцца, сказаць не магу, але дакладна павысіцца. Мяркую, што, пакуль колькасць бюджэтных месцаў будзе меншая, чым колькасць ахвотных атрымаць вышэйшую адукацыю, інстытут рэпетытарства будзе запатрабаваны.

***— А калі бацькі плацяць школьнаму настаўніку за індывідуальныя заняткі з іх дзіцем, ці не парушаюцца пры гэтым нейкія маральныя нормы?***

— Калі бацькі давяраюць школьнаму настаўніку і гатовы плаціць за яго дадатковую работу, то што ў гэтым дрэннага? Але ўсё павінна быць афіцыйна. Іншая справа, што далёка не кожны настаўнік пажадае браць на сябе такую адказнасць. Любы школьны настаўнік сёння можа зарэгістравацца ў падатковай інспекцыі і аказваць паслугі рэпетытарства. У іх ёсць такое права...

**Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

# ТАТАЛІТАРЫЗМ 2.0



**У нас.** На апошнім тыдні чэрвеня баставалі гандляры рынкаў і гандлёвых цэнтраў. Дакладней, прыкладна 70% «іпэшнікаў». Для беларускай рэчаіснасці забастоўка ўвогуле з'ява дзіўная. Але яшчэ больш дзіўным выглядае тое, што ў ёй удзельнічаюць прадпрымальнікі. Звычайна ж бастуюць наёмныя работнікі.

Прычыны для адстойвання сваіх інтарэсаў у прадпрымальнікаў ёсць — увядзенне новага тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза, які прадугледжвае ўсеагульную сертыфікацыю тавараў. Рашэнне зразумелае і карыснае для спажыўцоў, але не для нашых дробных і сярэдніх гандляроў, якія, як вядома, свой тавар прывозяць звычайна з Масквы альбо іншых мясцін без усялякіх сертыфікатаў, а значыць, і гарантый якасці. Зразумела, што новыя правілы прыйшліся ім не даспадобы. Склалася і рэальная пагроза для пакупнікоў, бо наш «прадпрымальніцкі клас» рэагуе на любыя змены ў правілах гандлю павышэннем кошту тавараў.

Урад на выступленне прадпрымальнікаў адрэагаваў досыць спакойна і з разуменнем іх праблем. Яшчэ напярэдадні забастоўкі з Масквы прыехалі прадстаўнікі Еўразійскай эканамічнай камісіі, каб прыняць удзел у Форуме прадпрымальнікаў і пагутарыць з лідарамі незадаволеных. Падчас самой забастоўкі прайшлі перамовы прадстаўнікоў «іпэшнікаў» з кіраўніцтвам Міністэрства эканомікі. Урадавыя чыноўнікі паабяцалі, што будуць хадайнічаць аб унясенні пэўных змен у сумесную пастанову шэрагу міністэрстваў, накіраваную на выкананне тэхрэгламенту. Гэта значыць фактычную адтэрміноўку на некалькі месяцаў сертыфікацыі тавараў.

Аднак лідары прадпрымальнікаў засталіся не зусім задаволенымі. Перамоўны працэс працягваецца.

Нічога незвычайнага ў гэтай сітуацыі няма. У перыяд стварэння буйных інтэграцыйных супольнасцяў заўжды адбываецца «прыцірка інтарэсаў». Зразумела, што сертыфікацыя тавараў непазбежная — гэта натуральны працэс. Але і праблемы дробных гандляроў трэба ўлічыць. Плюсам прадпрымальніцкага руху з'яўляецца тое, што пакуль яны не дазволілі нікому палітызаваць свае дзеянні і патрабаванні. Калі здолеюць захаваць гэтую пазіцыю, то яна стане добрым падмуркам для выканання іх патрабаванняў.

**Вакол нас.** На нашых вачах адбываюцца падзеі, якія ўвойдуць у падручнікі дыпламатыі. Збеглы амерыканскі супрацоўнік спецслужбаў (былых, як мы ведаем, не бывае) Эдвард Сноўдэн задаў цяжкую задачу кіраўнікам знешнепалітычных службаў адразу некалькіх краін.

Дзяржаўны дэпартамент ЗША імкнецца вярнуць Сноўдэна на радзіму, каб аддаць пад суд. Кітай, куды той спачатку перабраўся, не хацеў выдаваць уцекача Злучаным Штатам, але і сапсаваць адносіны з Вашынгтонам таксама не імкнуўся, таму «адфутболіў» таго ў Расію. Цяпер Крэмль апынуўся ў дваістым становішчы. Відавочна, што там не хочуць выдаваць Сноўдэна амерыканцам, але і пакідаць яго на ўласнай тэрыторыі таксама не жадаюць. Далей разгарнулася ўвогуле дэтэктыўная гісторыя. Шэраг еўрапейскіх краін западозрылі, што Сноўдэн можа знаходзіцца ў самалёце прэзідэнта Балівіі Эва Маралеса. Францыя, Іспанія і Партугалія не далі дазволу на пралёт балівійскага «борта № 1» над сваёй тэрыторыяй. У выніку Сноўдэна на борце не аказалася, Маралес як герой вярнуўся дадому праз Вену, а адносіны ЕС з Паўднёвай Амерыкай апынуліся ў часовым крызісе.

Пакуль адказныя дзяржаўныя мужы вядуць паміж сабой прыязныя і не вельмі размовы, вырашаючы яго лёс, сам Эдвард Сноўдэн знаходзіцца ў транзітнай зоне міжнароднага аэрапорта ў Маскве.

А правініўся Сноўдэн тым, што распаўсюдзіў вельмі карысную для нас, карыстальнікаў інтэрнэту, інфармацыю: ніякай свабоды ў глабальным сеціве няма! Дарэчы, пра гэта мы і так ведалі, проста амерыканскі камп'ютаршчык, які супрацоўнічаў са спецслужбамі, дакладна пацвердзіў нашыя здагадкі. Цэнтральнае разведвальнае ўпраўленне і Агенцтва нацыянальнай бяспекі ЗША кантралююць мільярды тэлефонных размоў, электронных паведамленняў, усе сацыяльныя сеткі праз спецыяльную праграму PRISM. Іх брытанскія калегі робяць усё тое самае праз праграму Tempora. Прычым шпіёняць яны і за ўласнымі грамадзянамі, і за сваімі саюзнікамі з Еўрасаюза. Выключэнне не робіцца ні для кога. Ніякай канфідэнцыяльнасці ў інтэрнэце няма. Калі вы выкладаеце свае персанальныя звесткі, пішаце сябрам свае асабістыя навіны, вы запаўняеце ўласны файл у архівах ЦРУ і АНБ, які ў любы момант можа быць выкарыстаны супраць вас. Што гэта, як не таталітарызм? Але ўжо зусім новага кшталту. Як прынята казаць зараз, гатунку 2.0.

**З гісторыі.** У чэрвеньскія дні 1974 года паміж Мінскам і Масквой раптоўна ўзнікла пэўнае напружанне. Не, ніякага канфлікту не адбывалася. Усе чакалі вельмі важнага рашэння. Нарэшце чаканні спраўдзіліся. 26 чэрвеня з Масквы прыйшла тэрміновая ўрадавая тэлеграма. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР ўганараваў сталіцу Беларусі званнем «Горад-герой».

Барацьба за тое, каб Мінск атрымаў належнае прызнанне сваіх заслуг ішла амаль увесь пасляваенны час. Першым гэтае пытанне ўзняў Панамарэнка, потым некалькі разоў рабіў адпаведныя захады Машэраў. І ўсё было дарэмна. Чаму?

Галоўная заслуга Мінска ў гады вайны — дзейнасць самага вялікага ў Еўропе гарадскога антыфашысцкага падполля. Яго гісторыя доўгі час заставалася заблытанай, малавядомай. Аднаўленне праўды аб мінскіх падпольшчыках заняло доўгія гады. Дарэчы, канчаткова яны былі рэабілітаваны толькі вясной 1990 года — больш за чвэрць стагоддзя пасля таго, як Мінск стаў «Горадам-героем».

Але тады, у чэрвені і ліпені 1974 года, мала хто з беларусаў думаў пра тыя перыпетыі. Ведалі, што напярэдадні выйшаў цыкл артыкулаў «1.100 дней» Мікалая Матукоўскага ў «Известиях», дзе распавядалася пра подзвіг мінчан у гады вайны. Ведалі, што да гэтага была кніга Івана Новікава «Руіны страляюць ва ўпор», а потым шасцісерыйны фільм па гэтай кнізе. Ведалі, што Машэраў і Мазураў нарэшце дамагліся свайго. І гэта стала перамогай для ўсёй рэспублікі.

Праўда, Леанід Брэжнеў прывёз геройскую зорку і ордэн Леніна толькі праз чатыры гады. Але летам 1974-га пра гэта яшчэ ніхто не думаў. Людзі радаваліся. 3 ліпеня, калі святкавалі юбілей вызвалення сталіцы, стала сапраўды агульнанацыянальным святам. Можа, першым за ўсе пасляваенныя гады.

■ У свеце

# ЕГІПЕЦКІ ПРАКЛЁН



**Сусветны фінансавы крызіс негатыўна адбіўся на мностве краін. Можна спісаць на яго і смутныя падзеі ў Егіпце на працягу двух апошніх гадоў. Яшчэ нядаўна ўзорная краіна па спакоі і высокіх тэмпах росту эканомікі стала полем для бітвы палітычных сіл, стыхійных дэманстрацый з людскімі ахвярамі і ваенных пераваротаў. На фоне масавых пратэстаў у Балгарыі, Бразіліі і Турцыі, у якіх удзельнічалі мільёны грамадзян гэтых краін, егіпецкая апазіцыя да дзейнага прэзідэнта арганізацыйна аформілася ў «Фронт 30 чэрвеня» з дэвізам «Бунт» і заявіла, што 30 чэрвеня — у першую гадавіну прэзідэнцтва Мурсі — выступіць з мэтай яго звяржэння.**

Так яно і адбылося. На вуліцы выйшлі мільёны, паколькі ў выніку сур'ёзнага пагаршэння эканамічнай сітуацыі з моманту папярэдняй рэвалюцыі ў такой вялізнай краіне, як Егіпет, назбіралася шмат незадаволеных. Пачаліся сутыкненні з паліцыяй і пралілася першая кроў. На гэтай падставе армія выставіла свой ультыматум: на працягу двух сутак прэзідэнт і апазіцыя павінны прыйсці да кампрамісу. У адваротным выпадку яна зробіць свой ход. Пасля заканчэння ўльтыматуму вайскоўцы арыштавалі прэзідэнта Егіпта Мурсі і прызначылі выконваць яго абавязкі старшыню Канстытуцыйнага суда Егіпта Адлі Мансур. Неўзабаве ён прынёс прысягу ў якасці часовага кіраўніка дзяржавы. Новаму «прэзідэнту» даручылі скласці дарожную карту па выхадзе з крызісу, а таксама заняцца складаннем новай канстытуцыі краіны.

У таго, што адбылося, ёсць і іншыя прычыны, акрамя эканамічных. Адной з галоўных з'яўляецца рэлігійная падаплёка. Дзесяцігоддзямі дзяржаўны апарат Егіпта быў зарыентаваны на пераслед ісламісцкіх арганізацый, уключаючы самую папулярную — «Браты-мусульмане», з якой выйшаў сам Мурсі. У газеце Le Figaro ад 4 ліпеня 2013-га было правільна адзначана, што «ён атрымаў у спадчыну дзяржаву, якая практычна не функцыянавала», у якой, як зазначаюць эксперты, чыноўнікі «падазрона ставіліся да выхадца з рэлігійнай арганізацыі «Браты-мусульмане».

Вялікія шанцы, што пасля звяржэння дзейнага прэзідэнта гэтая арганізацыя можа зрабіць крокі ў адказ. Менавіта пра гэта, паводле звестак газеты Chicago Tribune, заявіў адзін з высокапастаўленых чыноўнікаў «Братоў-мусульман». Больш за тое, ён адзначыў, што гвалтоўнае адхіленне ад улады прэзідэнта можа прывесці да гвалту ў адказ з боку іншых незадаволеных гэтым арганізацый.

4—5-гадовыя тэрміны знаходжання прэзідэнтаў ва ўладзе ў большасці краін свету з'явіліся не проста так. Немагчыма зрабіць нешта сур'ёзнае для краіны за паўгода або год. Таму ўмяшанне арміі, якая адхіліла прэзідэнта Мурсі ад улады на падставе пратэстных дэманстрацый, сапраўды з'яўляецца класічным ваенным пераваротам і не можа мець ніякіх апраўданняў.

Гэтым выклікана і нечаканая для ўдзельнікаў перавароту рэакцыя ЗША. У Егіпце ўжо неяк прывыклі да таго, што ЗША падтрымлівала ўсе этапы па звяржэнні Мубарака і вырашылі, што любая смута з адхіленнем ад улады прэзідэнта будзе аўтаматычна ўхвалена ў Вашынгтоне. Дзе там! Прэзідэнт ЗША Барак Абама заявіў: «Я заклікаю армію Егіпта рухацца хутка і адказна да вяртання ўсёй улады ў рукі дэмакратычна выбранага грамадзянскага ўрада праз раўнапраўны і празрысты працэс, а таксама пазбягаць любых адвольных арыштаў прэзідэнта Мурсі і яго прыхільнікаў».

Барака Абаму можна зразумець. Толькі-толькі ў Егіпце ўсё крыху супакоілася і ён прыняў віншаванні за ўклад ЗША ў пераход Егіпта ў дэмакратычнае рэчышча кіравання, як раптам раз — і ўсе намаганні ў момант пайшлі прахам. А прэзідэнт Мурсі ж паспеў ужо давесці сваю лаяльнасць Вашынгтону, няхай і быў да свайго прэзідэнцтва членам ісламісцкай арганізацыі, якая дастаткова адмоўна ставілася да ЗША. Узяць хоць бы той факт, што 15 чэрвеня 2013 года Мурсі выступіў з рэзкай заявай супраць прэзідэнта Асада, разарваў дыпламатычныя адносіны з Сірыяй і нават заклікаў да ўвядзення беспалётнай зоны над гэтай краінай.

А вось хто зараз прыйдзе да ўлады замест яго і як гэты чалавек будзе ставіцца да ЗША і, што не менш важна для амерыканцаў, да іх самага важнага ў рэгіёне саюзніка — Ізраіля? У той жа час ЗША пакінулі сабе і ход для манеўру. Калі вярнуць прэзідэнта Мурсі да ўлады не атрымаецца, Злучаныя Штаты, верагодна, змогуць задаволіцца, калі да ўлады прыйдзе іншы прэзідэнт, зноў абраны на агульнанародных выбарах. Менавіта яго і прызнаюць кіраўніком «дэмакратычна выбранага грамадзянскага ўрада». Галоўнае — каб ён быў лаяльны да ЗША.

Як могуць развівацца падзеі далей? Самы жаданы варыянт — мірны кампраміс паміж адхіленым прэзідэнтам, арміяй і апазіцыяй. Толькі ён дазволіць знайсці варыянт, пры якім да ўжо загінулых дзясяткаў грамадзян Егіпта не дададуцца новыя ахвяры. Іншыя сцэнарыі больш песімістычныя. Але, як паказвае практыка, у апошнія гады ў арабскіх краінах значна часцей пачынаюць рэалізоўвацца больш песімістычныя сцэнарыі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

## ДАЎГІ ВЫПЛАЦІЛІ, АЛЕ РЭЗЕРВЫ СКАРАЦІЛІСЯ

По выніках чэрвеня золатавалютныя рэзервы Беларусі ў вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ скараціліся на 9,5 млн долараў ЗША і на 1 ліпеня склалі 8,0176 млрд долараў ЗША ў эквіваленце, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў скараціўся на 404,9 млн долараў ЗША і на 1 ліпеня склаў 8,6326 млрд долараў ЗША ў эквіваленце. «Скарачэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў у асноўным абумоўлена зніжэннем цэны на золата на міжнародным рынку каштоўных металаў, а таксама пагашэннем знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

*Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд №88»*

**18 июля 2013 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Мостоотряд №88»**

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О выплате дивидендов за 2 квартал 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 10 июля 2013 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения Общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться, – в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания с **15.30** до **15.55** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 18 июля 2013 года в 16.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 9 июля 2013 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

*Наблюдательный совет*

УНП 100299744

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гродненская табачная фабрика «Неман» в части реквизитов для внесения задатка за право участия в аукционе**

| | |
|---|---|
| Номер р/с для перечисления задатка по лоту № 1 | Р/с 3012 57917 0033 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. Задаток вносится в евро на счет организатора аукциона – Гродненского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| Номер р/с для перечисления задатка по лотам № 2 – № 6 | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. Задаток вносится в белорусских рублях на счет организатора аукциона – Гродненского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Аукцион состоится 17 июля 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.** | |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.** | |
| **Последний день приема заявлений 16 июля 2013 г. до 15.00.** | |

Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by

# СТАЦЬ ПРАФЕСІЯНАЛАМ У СТУДЭНЦКІЯ ГАДЫ?

## у БДУІР упэўнены, што гэта магчыма

**Стаць студэнтам і не памыліцца з выбарам прафесіі — задача нумар адзін для выпускніка. А задача нумар адзін для студэнта — знайсці работу яшчэ падчас вучобы. У студэнтаў многіх ВНУ магчымасці папрактыкавацца і падзарабіць паралельна з вучобай проста няма. Затое сярод студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі да 90 працэнтаў пяцікурснікаў ужо працуюць па спецыяльнасці і адчуваюць сябе ў прафесіі вельмі ўпэўнена.**

**Наколькі паспяхова ўдаецца сумяшчаць студэнтам вучобу і работу? Што ў іх жыццёвых прыярытэтах стаіць на першым месцы: вучоба, набыццё практычнага вопыту ці магчымасць падзарабіць? Як выкладчыкі ўніверсітэта ставяцца да студэнтаў, якія працуюць і зарабляюць нярэдка нават больш за іх? І ці разглядаюць наймальнікі студэнтаў як раўнапраўных калег? Сваім меркаваннем на гэты конт мы папрасілі падзяліцца ўсе зацікаўленыя бакі.**

Барыс НІКУЛЬШЫН, прарэктар па вучэбнай рабоце і інфарматызацыі БДУІР:

### «Працуй, круціся, але пот свой мне не паказвай»



— Нашы студэнты пачынаюць працаваць з трэцяга і нават другога курса. На малодшых курсах яны не працуюць, а, хутчэй, падпрацоўваюць. А ўжо з трэцяга—чацвёртага курса працуюць і вырашаюць канкрэтныя вытворчыя задачы.

Адзін з галоўных партнёраў БДУІР і, адначасова, заказчык кадраў — Парк высокіх тэхналогій. Парк вельмі імкліва расце і ўцягвае ў арбіту сваёй дзейнасці вялікую колькасць нашых студэнтаў. Сёння ўсе хочуць, каб да іх прыходзілі маладыя спецыялісты, гатовыя адразу пасля заканчэння вучобы, «без разбегу», вырашаць складаныя практычныя і інавацыйныя задачы. Але для гэтага ў падрыхтоўку спецыялістаў трэба інвеставаць. Той, хто гэта разумее, інвестуе ў сваю будучыню. У Парку, на шчасце, сітуацыю разумеюць. Інфармацыйныя тэхналогіі — вельмі дынамічная галіна, а ў Парку ў нашых студэнтаў ёсць магчымасць вывучаць на практыцы самыя перадавыя тэхналогіі. Пакуль тыя дойдуць да студэнцкай аўдыторыі ў выглядзе нейкай тэарэтычнай выкладкі ў падручніку, яны будуць ужо не актуальныя. Больш за тое, зараз ІТ-прадпрыемствамі ва ўніверсітэце створана больш як 30 вучэбна-навукова-вытворчых лабараторый. Што такое сумесная лабараторыя? Гэта значыць, там усё «заточана» пад заказчыка. Але адначасова з гэтым фінансаванне лабараторыі — гэта ўклад у агульную падрыхтоўку ІТ-спецыялістаў для ўсёй краіны, паколькі кампанія, якая стварае лабараторыю, бярэ да сябе на работу не ўсіх нашых студэнтаў і выпускнікоў, а ўмовы навучання паляпшае для ўсіх, як і канкурэнтаздольнасць выпускнікоў на ІТ-рынку. А ў верасні ў Парку пачнуць працаваць і філіялы трох нашых кафедраў...

Да таго ж ІТ-кампаніі пастаянна запрашаюць студэнтаў на свае курсы. Нават тут яны не баяцца набіраць людзей з залішкам, загадзя ведаючы, што запросяць да сябе працаваць толькі дзясятую частку.

Што тычыцца стаўлення выкладчыкаў і кіраўніцтва ўніверсітэта да таго факту, што большасць нашых студэнтаў працуе, то мы такую самастойнасць толькі вітаем. Больш за тое, студэнт, які на старшых курсах яшчэ не працуе, выклікае ў нас здзіўленне: напэўна, з ім штосьці не так? У заходніх краінах студэнт, які вучыцца і працуе, — гэта норма. Там у моладзі ёсць разуменне, што трэба разлічваць у першую чаргу на сябе, а не на бацькоў. У мае студэнцкія гады сумяшчаць вучобу і работу было амаль немагчыма. Хіба толькі летам можна было падзарабіць у складзе будаўнічых атрадаў, што мы з задавальненнем і рабілі. Адлічэнне пагражала студэнту за 8 прапушчаных гадзін. А калі я выкладаў на трэцім, чацвёртым і пятым курсах і бачыў паўзапоўненую аўдыторыю, то разумеў, што студэнты не проста прагульваюць заняткі. **Аднак падчас сесіі — ніякіх патуранняў. І калі студэнт просіць літасці, «бравіруе сваімі мазалямі», пачынае скардзіцца (маўляў, працую, а на вучобу часу зусім не застаецца), я заўсёды ў яго пытаюся: «Ты змог распаралеліць працэс вучобы і заробку? Калі не атрымліваецца сумяшчаць абодва заняткі без шкоды для вучобы, кідай або вучобу, або работу. А калі не хочаш адмаўляцца ні ад чаго, то, калі ласка, працуй, круціся, але пот мне свой не паказвай...»**

> «Навучанне — гэта бізнес.
> І які толк будзе, калі ты заробіш грошы, але класным спецыялістам так і не станеш?»

Адразу скажу, што адназначна не вітаюцца ва ўніверсітэце пропускі агульнаадукацыйных дысцыплін — фізікі, матэматыкі, асабліва на малодшых курсах. Мы цудоўна разумеем, што гэтыя веды на вытворчасці ні атрымаць, ні падмацаваць немагчыма. А на спецдысцыплінах у нас цярплівае стаўленне да пропускаў, таму што там усё наадварот: не выключана, што на працоўным месцы студэнт зможа атрымаць нават больш ведаў, чым на лекцыях. Хоць калі ў аўдыторыю прыходзіць не класічны выкладчык, а малады асістэнт, які, як правіла, працуе ў нас на чвэрць ці на палову стаўкі, і сумяшчае выкладчыцкую работу з работай у ІТ-сферы, то на іх лекцыях аўдыторыі не пустуюць. Практыкі разглядаюць выкладанне студэнтам, хутчэй, як хобі, бо, зразумела, што заробак выкладчыка іх зацікавіць не можа.

Як я ўжо казаў, на другім і трэцім курсах ужо многія студэнты працуюць, праўда, як правіла, яшчэ не па сваёй спецыяльнасці. Але ў нас ва ўніверсітэце склалася практыка, што на трэцім курсе ўжо трэба шукаць работу па сваёй будучай спецыяльнасці. Можна, вядома, працаваць і ў «Макдональдсе», але гэта значыць, проста марнаваць час. Я заўсёды кажу сваім студэнтам: «Навучанне — гэта бізнес. І які толк будзе, калі ты заробіш грошы, але класным спецыялістам так і не станеш?»

Між іншым, салідныя фірмы (такія, напрыклад, як «EPAM Systems») пачынаюць супрацоўнічаць толькі з тымі студэнтамі, якія закончылі трэці курс. І на свае адукацыйныя курсы яны таксама запрашаюць студэнтаў толькі старшых курсаў. Гэта адказнасць за тое, каб малады чалавек не захапіўся работай і не кінуў вучобу.

Віктар СУВОРАЎ, выпускнік факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР, вядучы інжынер аддзела прыкладных распрацовак кампаніі «R-Style Lab»:

### «Будзе вопыт — грошы будуць прапаноўваць самі наймальнікі»



— Так сталася, што ў ІТ-кампанію «Эканоміка — Софт» я трапіў яшчэ на першым курсе, а дапамог знайсці работу мой аднагрупнік. Можна сказаць, мне пашанцавала і мая работа адразу была звязана з той спецыяльнасцю, што я атрымліваў у БДУІР. Прызнаюся, што прыкладна да трэцяга курса не так шмат часу прысвячаў сваёй вучобе, але затым мае прыярытэты змяніліся. Я, так бы мовіць, адчуў смак да вучобы. Мне пашанцавала працаваць на такіх праектах, дзе патрабаваліся фундаментальныя веды. Напрыклад, мы рабілі аналіз ДНК: там былі задзейнічаны і медыцынская генетыка, і матэматычная статыстыка, і бінарная логіка, і тэорыя верагоднасці, і тэорыя баз даных... І калі б я выпаў з навучальнага працэсу, то не ўдзельнічаў бы ў гэтым цікавым праекце. На апошняй сесіі ў мяне быў бал 10,0. А на дзвюх папярэдніх — 9,8 і 9,5. І пры гэтым я ўвесь час працаваў, наведваў курсы, рабіў партал факультэта. Натуральна, што ведаць усё немагчыма. І ўпэўненасць прыходзіць з вопытам практычнай работы. Але, напрыклад, прыходжу я на новае месца працы і ў мяне цікавяцца, ці працаваў я калі-небудзь з лічбавымі подпісамі. Прызнаюся, што не працаваў і ведаю толькі тэарэтычныя асновы, але я гатовы вучыцца. Мяне адпраўляюць у трохдзённую камандзіроўку ў Маскву. За месяц я разабраўся. Галоўнае — гатоўнасць прыстасоўвацца пад абставіны і патрэбы кампаніі.

А самы «тупіковы» перыяд у мяне быў на трэцім курсе, калі я збіраўся змяніць кірунак сваёй дзейнасці: працаваў на адной мове праграмавання ў адной сферы, а хацеў перайсці на іншую мову ў іншую сферу. Вельмі шмат узнікала пытанняў. Даводзілася шмат вывучаць спецыялізаванай літаратуры, звяртацца да знаёмых. Змяніў работу і працаўладкаваўся ў кампанію «IBA Group» я менавіта пасля трэцяга курса. Проста калі я бачу, што дасягнуў мяжы, іду далей, бо калі ты не развіваешся, то працаваць становіцца нецікава.

> «Магчымасць набыцця практычнага вопыту лічу пры працаўладкаванні галоўным прыярытэтам».

Пры працаўладкаванні я б параіў студэнтам глядзець, наколькі ім зручна будзе сумяшчаць вучобу і работу ў гэтай кампаніі, прычым размаўляць трэба менавіта з тымі людзьмі, пад непасрэдным кіраўніцтвам якіх ты будзеш працаваць. Мне з кіраўніцтвам заўсёды шанцавала. Вядома, пры размеркаванні задач улічвалася, студэнт ты ці не, і ці можаш пагрузіцца ў праект на 24 гадзіны ў суткі. З уласнага досведу магу сказаць, што пры жаданні можна нічога ва ўніверсітэце не прапускаць. У мяне і на першай, і на другой, і на трэцяй рабоце была дамоўленасць з кіраўніцтвам: калі я вучуся ў першай палове дня, то ў другой палове дня — працую, і наадварот. Кіраўніцтва заўсёды ішло мне насустрач, але і я ніколі не падводзіў людзей: калі абяцаў, што выканаю тую ці іншую работу, то абавязкова выконваў. Ці быў у мяне вольны час? *(Смяецца.)* У вольны час я наведваў курсы па праектаванні праграмнага забеспячэння, курсы па бухгалтэрыі, удзельнічаў у праектах свайго факультэта. Зрэдку — валейбол і басейн. Але мяне ўсё задавальняла. Насамрэч, калі ў цябе проста шалёны рытм жыцця, ты разумееш, што расслабляцца няма часу. Прыбег дадому, у цябе ўсяго 5 хвілін на тое, каб падсілкавацца, і ты ляціш далей. І вось, што дзіўна: чым больш ты на сябе грузіш задач, тым радзей узнікае жаданне расслабіцца. Магчыма, мне было прасцей, таму што мае бацькі заўсёды ставілі пытанне наступным чынам: калі ты хочаш штосьці атрымаць, то трэба працаваць. Таму працоўны вопыт я займеў яшчэ ў школьныя гады. А калі стаў студэнтам, патрэбы дадаткова ўзраслі, таму пошук працы выглядаў цалкам лагічным ...Магчымасць набыцця практычнага вопыту лічу пры працаўладкаванні галоўным прыярытэтам, а будзе вопыт — грошы будуць прапаноўваць самі наймальнікі.

Андрэй КУЛЬГАЧОЎ, дырэктар ТАА «Тэхартгруп»:

### «Шукаем таленавітых і ўлюбёных у сваю прафесію»

— Прыкладна 15% супрацоўнікаў нашай кампаніі складаюць студэнты. Большасць з іх — студэнты БДУІР, што цалкам заканамерна, паколькі ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі — лідар у вобласці падрыхтоўкі ІТ-спецыялістаў у нашай краіне.

> «Калі чалавек прыйшоў да нас працаваць, то ён апрыёры становіцца раўнапраўным членам каманды»

Магчымасць атрымаць у нашай кампаніі развіццё ў прафесійным плане ёсць як у спецыялістаў са шматгадовым вопытам работы, так і ў студэнтаў без вопыту. Часта ў падборы супрацоўнікаў мы кіруемся прынцыпам Іцхака Адызеса: «Прасцей узяць на работу асобу, якая сфарміравалася, і навучыць яе таму, што яна абавязана ведаць, чым узяць каго-небудзь з ведамі і фарміраваць яго як асобу».

**Студэнт, які марыць у нас працаваць, павінен быць ініцыятыўным, мэтанакіраваным і пастаянна імкнуцца да самаразвіцця. Таксама бяруцца пад увагу камунікабельнасць і навыкі работы ў камандзе,** таму што наш асноўны від дзейнасці — праектная работа, а значыць, уменне слухаць, дапамагаць калегам і знаходзіць з імі агульную мову ў рабоце — прынцыпова важныя.

Ці маюць для нас значэнне адзнакі ў залікоўцы? Высокія балы — гэта несумненны плюс, бо, як паказвае практыка, студэнты, якія маюць добрыя адзнакі падчас вучобы, больш падрыхтаваны і да работы. Фундаментальныя веды па спецыяльнасці дазваляюць сфарміраваць добрую прафесійную базу. Але паспяховасць — не адзіны крытэрый адбору, таму што мы, у першую чаргу, шукаем таленавітых і працалюбівых спецыялістаў, улюбёных у сваю прафесію людзей.

Безумоўна, работа па сумяшчальніцтве — дадатковая нагрузка для студэнтаў. Мы гэта добра разумеем і заўсёды ідзём насустрач сваім супрацоўнікам: прапануем ім гібкі графік, даём на час здачы сесіі водпуск. Насамрэч, многае залежыць ад канкрэтнага чалавека: яго працаздольнасці і імкнення сумяшчаць заняткі ва ўніверсітэце і работу. Як сведчыць шматгадовы вопыт «Тэхартгруп», у нашых работнікаў, якія вучацца, праблем з паспяховасцю не ўзнікае. І ўвогуле, у нашай кампаніі няма раздзялення на студэнтаў і не студэнтаў. Калі чалавек прыйшоў да нас працаваць, то ён апрыёры становіцца раўнапраўным членам каманды. Кожны студэнт атрымлівае магчымасць працаваць побач з прафесіяналамі на цікавых праектах вядомых сусветных кампаній, выкарыстоўваць у рабоце навейшыя тэхналогіі і атрымліваць годную заработную плату.

Што тычыцца магчымасці размеркавацца да нас пасля заканчэння навучання ў ВНУ, то, паколькі «Тэхартгруп» з'яўляецца рэзідэнтам Парка высокіх тэхналогій, шанцы ў студэнтаў трапіць да нас дастаткова высокія.

Я сам пачаў працаваць па спецыяльнасці з 4-га курса. І першым сур'ёзным месцам работы быў Навукова-даследчы інстытут сродкаў аўтаматызацыі. Мне тады пашанцавала, і я трапіў на буйны праект, дзе змог атрымаць каштоўны вопыт і папрацаваць з граматнымі спецыялістамі. Лічу, што праца падчас навучання пайшла мне толькі на карысць, і я паглядзеў на вучобу з новага боку. Паколькі я практык, мне было цікава прымяняць атрыманыя ва ўніверсітэце веды ў рамках рэальнага праекта.



Калі перад студэнтам яшчэ толькі стаіць пытанне з пошукам месца працы, то я б рэкамендаваў шукаць тую кампанію, дзе вам будзе найбольш камфортна развівацца ў прафесійным плане. Як правіла, гэта прадпрыемствы з добрай рэпутацыяй і высакакласнымі спецыялістамі, у якіх ёсць чаму навучыцца. А вось памер заробку, на мой погляд, з'яўляецца вытворнай ад твайго прафесійнага ўзроўню.

### Алгарытм кар'ернага росту




(2+2)+2=ПОСПЕХ
БДУІР – ГЭТА НАДЗЕЙНА

Каментарый прарэктара БДУІР Барыса НІКУЛЬШЫНА:

### АЛГАРЫТМ УЯЎЛЯЕ САБОЙ 4 КРОКІ.

**Першы крок:** усяго на першы курс на бюджэтную форму навучання мы набіраем 1100 чалавек. Гэта значыць, адбяром 1070 лепшых заяў сярод тых, хто здаваў фізіку, матэматыку і дзяржаўную мову — на спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю, і 30 лепшых — на эканамічны профіль (з абітурыентаў, якія здавалі ЦТ па дзяржаўнай мове, матэматыцы і замежнай мове).

**Другі крок:** глядзім па заявах, хто якую спецыяльнасць указаў, і залічваем па балах. Калі абітурыент усё ж не трапіў ні на адну з тых спецыяльнасцяў, што ўказаны ў яго заяве, яго пакідаюць у рэзерве. Далей такім абітурыентам прапануюць залічэнне на роднасныя спецыяльнасці, дзе ёсць свабодныя месцы.

Разам з тым усе, хто не трапіў у 1100 лепшых, могуць удзельнічаць у конкурсе на платнае аддзяленне. Схема залічэння там такая ж. Адзінае адрозненне: абітурыенты могуць у заяве згадваць спецыяльнасці розных формаў навучання: дзённую, завочную, вячэрнюю або дыстанцыйную.

**Трэці крок:** пасля 1-га і 2-га курса кожны студэнт можа змяніць спецыяльнасць. Пры жаданні можна нават перайсці з эканамічнага профілю на тэхніка-тэхналагічны. Без праблем. Дысцыпліны, якіх не хапае, можна вывучаць дыстанцыйна і здаць экстэрнам па тэхналогіі дыстанцыйнага навучання БДУІР. Так што рашэнне прыёмнай камісіі — не прысуд. Калі вы не трапілі на спецыяльнасць, пра якую марылі пры паступленні, усё можна выправіць!

Далей перад студэнтамі стаіць выбар — ісці на вытворчасць або прадоўжыць навучанне ў магістратуры. У БДУІР навучанне ў магістратуры праводзіцца па двух кірунках: навукова- даследчым і практыка-арыентаваным. Навукова-даследчая магістратура разглядаецца як падрыхтоўка да сур'ёзнай навуковай работы ў аспірантуры. А мэта практыка-арыентаванай магістратуры — удасканаленне інжынернай падрыхтоўкі і больш хуткае дасягненне высокіх кваліфікацый.

**Чацвёрты крок** — гэта аспірантура. Сур'ёзная навуковая работа.

Сяргей КАЗЛОВІЧ, студэнт 3-га курса факультэта тэлекамунікацый БДУІР:

### «Работа дысцыплінуе студэнта і пазбаўляе эгаізму»



— Я прыехаў вучыцца ў БДУІР з Брэста. Вялікі горад, вялікія патрэбы... Іншагароднім студэнтам прыстасавацца да новага жыцця больш складана, чым мінчанам, якія жывуць разам з бацькамі. Інтэрнат адразу не атрымаў, таму пошук работы для мяне быў вельмі актуальны. Сёння я працую відэаінжынерам на тэлеканале АНТ, куды трапіў пасля заканчэння першага курса. Разумею, што мне пашанцавала: я прыйшоў на тэлеканал летам, калі яго супрацоўнікі масава ішлі ў адпачынак. Але, напэўна, нічога выпадковага не бывае. Вельмі карысным аказаўся вопыт, атрыманы на тэлестудыі БДУІР. А на тэлестудыі ўніверсітэта я аказаўся, у сваю чаргу, таму, што яшчэ ў школе спрабаваў манціраваць сюжэты, няхай і на прымітыўным узроўні .

Тыдзень стажыроўкі — і мяне ўзялі на пастаянную работу. Я быў самым маладым супрацоўнікам — усяго 18 гадоў. Не ўсё ў мяне адразу атрымлівалася. Але ў дапамозе ніхто з калег не адмаўляў. У нашым калектыве сёння працуюць людзі розных узростаў, але нейкім асаблівым я сябе ў кампаніі прафесіяналаў не адчуваю. Хіба толькі таму, што мой працоўны графік залежыць ад вучобы. Мы заўсёды можам адзін аднаго замяніць. У другую палову дня і ў выхадныя я звычайна працую. «Хвастоў» на вучобе не маю, стыпендыю атрымліваю. Калі адчуваю, што па нейкай дысцыпліне магу трохі дабавіць, то абавязкова гэта раблю. Але гінуць на вучобе не буду. Шчыра кажучы, працаваць мне больш цікава, чым вучыцца. Лічу, што калі б не было работы, то і жыццёвага вопыту не было б. Думку, што работа шкодзіць вучобе, катэгарычна не падтрымліваю. Наадварот, работа дысцыплінуе, вучыць цябе рацыянальна размяркоўваць свой час, будаваць доўгатэрміновыя планы і... пазбаўляе эгаізму. Сёння я ўжо незалежны ад сваіх бацькоў, магу распараджацца ўласным бюджэтам. І ў мяне ўжо нават ёсць уласны вопыт банкаўскіх крэдытаў. У прынцыпе, я прызвычаіўся круціцца яшчэ са школьных гадоў, таму калі ў мяне раптам выдаецца вольны час, то я ўпадаю ў ступар. Мая слабасць — гэта веласіпеды і ролікі. А сапраўдны рэлакс атрымліваю ад веласіпедных прагулак па начным горадзе. Вы, напэўна, не ўяўляеце сабе, які Мінск прыгожы і незвычайны, калі ўзыходзіць сонца!

> «Калі б не было работы, то і жыццёвага вопыту не было б. Думку, што работа шкодзіць вучобе, катэгарычна не падтрымліваю».

Ці можна знайсці ідэальную для студэнта работу? Мяркую, трэба шукаць любімую справу. У сваім жыцці нічога не выключаю. У мяне летась быў уласны сюжэт у тэлепраграме «Контуры», прысвечаны студэнцкім будаўнічым атрадам. Магчыма, што калі-небудзь і я буду ў кадры...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

УНП 100363945

■ Тэлепляцоўка

# УВАГА! НА ЭКРАНЕ — ДЗЕЦІ

**Не сакрэт, што сёння на беларускім тэлебачанні амаль поўнасцю адсутнічае дзіцячая тэлевізійная платформа. Дзіцячыя перадачы і праграмы для падлеткаў можна пералічыць літаральна на пальцах: «Пазакласная гадзіна» («Беларусь-2»), «Вугалёк» («СТБ»), «Калыханка» («Беларусь-3»). Была яшчэ цудоўная перадача «Бухта капітанаў» («Беларусь-2»), але і тая знікла.**

Такая неахопленасць дзіцячай аўдыторыі тэлебачаннем тлумачыцца непрыбытковасцю творчага праекта. Згодна з беларускім заканадаўствам, рэклама ўнутры дзіцячых праграм забаронена. Вось і атрымліваецца, што з-за адсутнасці цікавых пазнавальных тэлеперадач дзеці папаўняюць свой багаж ведаў з дапамогай інтэрнэту альбо на вуліцы.

А між іншым, глядзець ёсць што. Больш за тое, у Беларусі існуе прыватная тэлестудыя «Новы горад», якая робіць якаснае відэа, разлічанае на дзіцячую аўдыторыю. Толькі вось убачыць яго няма дзе: ніводны канал не адводзіць эфірны час пад дзіцячыя праграмы. І не таму, што яны дрэнныя.

Высокую якасць сваёй прадукцыі і прафесіяналізм яе творцаў тэлестудыя «Новы горад» вось ужо другі год запар пацвярджае на Міжнародным фестывалі дзіцячага тэлебачання «Уключайся!». Летась у намінацыі «Хачу ўсё ведаць» сярод пазнавальных праграм перамагла перадача «Пазакласная гадзіна». Сёлета тэлестудыя таксама атрымала першую ўзнагароду — у намінацыі «Навіны».

— На конкурсе было прадстаўлена 207 работ з розных краін свету, — расказвае генеральны прадзюсар тэлестудыі «Новы горад» Анжаліка АВЕРКАВА. — Гэта як Алімпійскія гульні, дзе інтрыга захоўваецца да канца. Канкурэнцыя жорсткая! Таму атрымаць міжнародную ўзнагароду, ды яшчэ і ў новай, вельмі прэстыжнай і складанай намінацыі «Навіны», дарагога каштуе. На жаль, што гэтага нават няма дзе паказаць.

Для параўнання, у Латвіі, меншай за Беларусь больш чым у 3 разы, дзяржаўныя тэлеканалы пад дзіцячае вяшчанне вылучаюць 1-2 гадзіны ў дзень. А ў той жа Башкірыі, таксама меншай за нашу краіну, ёсць уласны дзіцячы канал. У Расіі дзіцячае тэлебачанне абавязковае, але поўнасцю датацыйнае. Дарэчы, расіяне ствараюць інтэрнэт-сайт «Бумеранг», дзе тэлестудыя «Новы горад» будзе мець сваю пляцоўку для размяшчэння работ. Але гэта чужое, не наша.

Вось ужо на працягу 6 гадоў тэлестудыя займаецца вытворчасцю адукацыйных праграм для дзяцей. Сёлета на базе студыі пачала дзейнічаць уласная тэлешкола. «Навошта для здымак штораз праводзіць кастынгі, шукаць таленавітых дзяцей, калі можна рыхтаваць свае кадры?» — палічыла дырэктар студыі Людміла Канаплянік і ажыццявіла сваю задуму.

Сёння дзясяткі хлопчыкаў і дзяўчынак школьнага ўзросту наведваюць тэлешколу. Заняткі праводзяцца 2 разы на тыдзень. Прадметы — ад журналістыкі і акцёрскага майстэрства да рэжысуры і аператарскай справы. Тут жа і практычнае прымяненне атрыманых ведаў: дзеці самі робяць тэлевізійныя сюжэты, пішуць да іх сцэнарыі і нават манціруюць рэпартажы. Адным словам, вучацца экраннаму мастацтву ад «а» да «я».

Вядома, такое задавальненне каштуе грошай. Толькі сімвалічная плата за навучанне ў тэлешколе не перакрывае патрэбы яе існавання. Таму добрая справа ў асноўным трымаецца на энтузіязме яе стваральнікаў. Зараз, напрыклад, вельмі востра стаіць пытанне арэнднай платы за памяшканне на новы вучэбны год. Бясконца падымаць кошт навучання — непасільная ноша для большасці бацькоў.

Магчыма, іх дзеці ніколі не пачнуць працаваць на сапраўдным тэлебачанні, аднак набыты вопыт лішнім дакладна не будзе. Тым больш калі дысцыпліны ў тэлешколе выкладаюць вядомыя і таленавітыя рэжысёры, сцэнарысты, вядучыя тэлепраграм... Праводзяцца і майстар-класы з медыйнымі персонамі. Адным словам, прафесіяналы вучаць будучых прафесіяналаў!

— У дзіцячым тэлебачанні павінны ўдзельнічаць дзеці: яны не толькі вызначаюць рэйтынгі, яны робяць тое, што хочуць бачыць, — пераканана Анжэліка Аверкава. — У тэлешколу мы набіраем усіх, хто хоча. Тыя, каму не цікава, самі пойдуць. Гэта як у любым гуртку: дзеці пазнаюць сябе ў працэсе дзейнасці. У выніку застануцца тыя, каму гэта не толькі цікава, а і патрэбна. Тут ніхто нікога не вяселіць. Трэба разумець, што гэта дадатковая адукацыя, а не ўсе хочуць дадаткова вучыцца.

Наведваць тэлешколу можна бясконца. Толькі ў першы год навучання школьнікі засвойваюць тэорыю экраннага мастацтва, а пасля непасрэдна ўдзельнічаюць у стварэнні і арганізацыі тэлевізійных праграм. З-пад іх творчага крыла выходзяць дзіцячыя навіны, пазнавальныя і забаўляльныя перадачы, музычныя кліпы, рэклама, нават кінафільмы і серыялы...

Іх работа неаднаразова была ацэнена прафесіяналамі міжнароднага ўзроўню. Але не гэта галоўнае. Юным тэлевізійнікам так важна, каб іх справа дайшла да адрасата — да свайго сябра, аднагодка, выпадковага гледача. Для гэтага і патрэбен свой эфір, які яшчэ трэба знайсці.

**Вераніка КАНЮТА**

■

■ Асабістае

# СНЫ АД ФЕДЭРЫКА ФЕЛІНІ

Тэрмінаў засваення творчай спадчыны геніяльных творцаў няма: саспееш — чытай, глядзі, слухай...

Больш глыбока я пазнаёміўся з творчасцю Федэрыка Феліні на шостым дзясятку сваіх гадоў. Захапляльна атрымалася. «Круціў» яго фільмы ў камп'ютары: прыходзіў з працы, вячэраў, а тады паварочваў дысплей у бок сваёй канапкі і ўключаў для прагляду той ці іншы кінатвор Майстра. Падклаўшы руку пад галаву, уважліва глядзеў, а хвілін праз дзесяць-пятнаццаць, першы раз нечакана, а потым ужо зусім прадбачана, засынаў. Напачатку думалася: «Ат, стамляюся ў службовай куламесе, ды яшчэ авітаміноз даецца ў знакі, раздражнёнасць, кволасць кахання...» А потым зразумеў, што гэта Феліні закалыхвае мяне на сваёй відарыснай плыні. Як браты Люм'ер здымалі прыбыццё цягніка на вакзал Ла-Сіёты, так Феліні зладзіў прыбыццё сваіх кінасноў да свядомасці гледача.

Калі я раптам прачынаўся, дык тут жа заўважаў, што кінаплынь адносіла мяне далёка ўніз па рэчышчы стужкі — плаўна, вольна, анідзе не запыняючыся на каменьчыках няўдалага мантажу: гэтых каменьчыкаў проста няма. Як у сне.

Потым даводзілася вяртацца па гэтай плыні ўверх — да зацемленых у памяці кадраў ці выключаць камп'ютар і засынаць да раніцы, адкладваючы далейшы прагляд на заўтра. Так я мог цешыцца адной стужкай на працягу пяці-сямі вечароў. І прытым мне зусім не хацелася якіх-небудзь іншых праглядаў. Дастаткова было Феліні, яго свету і святла.

◆◆◆

У фільмаў Федэрыка зазвычай вельмі трывалая літаратурная аснова і сцэнарыі найбольш, чым у каго з кінематаграфістаў, сашчыльнены з відарыснай плынню. Калі заглыбляешся ў твор, сугучны тваёй душы, дык здаецца, што і ты менавіта так, а не інакш напісаў бы і зняў па напісаным фільм.

Знакаміты творца ў сваіх стужках вылушчвае з сацыяльнага шалупіння чалавечую асобу так старанна, што яна робіцца выразна бачнай у святле біблейскай абагуленасці.

◆◆◆

Феліні не можа пазбавіцца ад шчымлівай радасці адкрыцця свету, найперш — у малалецтве ды раннім юнацтве, і звязвае яе аскепкі ніткай асацыяцый... І ўвесь час азіраецца на Бога, а пры стварэнні свайго свету не асмельваецца і на каліва прыроўніцца да Высокага Творцы. Проста ўдала падбірае дзейных асоб ды рэжысуе свае згадкі мінулага і набыткі ўяўлення пра тое, якім было ці магло б быць жыццё.

У яго фільмах калі жанчына — дык прыгажуня з прыгажунь, калі мужчына — дык Марчэла Мастраяні...

І ўсе падпарадкаваны рэжысёрскаму змушэнню, прытым здаецца, што аддаюцца яго волі з вялікім задавальненнем. Хіба толькі адна актрыса, па ўсім відаць, выраклася якой-кольвечы заангажаванасці, усё адно як адчула сябе нароўні з Майстрам — Джульета Мазіна. Жонкі слаба паддаюцца нават геніяльнай рэжысуры.



Кажуць, што Феліні не надта ладзіў са сваёй Мазінай. Злыя языкі плявузгаюць, што яны зацята сварыліся, дапякалі адно аднаму. Блазнавалі, карацей кажучы...

У Феліні яно, блазнаванне, скрозь, амаль ва ўсіх фільмах. Гэта ж на працягу стагоддзяў правераны пратэст супраць брутальнай сацыяльнай стандартызацыі чалавека.

◆◆◆

Зноў заўважу: у стужках Майстра амаль не бачна мантажнае шво. Асацыяцыі не маюць выразных межаў, а толькі вытанчэнне, толькі чуйную зніцеласць у сваіх атожылках... Яны злёгку зачэпліваюцца адна за адну казытлівымі вусікамі далучанасці да лёсу аўтара.

І нас лёгка засмоктвае кругаход прыснёных Феліні пачуццяў-згадак. Раптам хочацца ўзяцца за рукі з блазнамі і музыкамі (кінафільм «8 1/2») ды зрабіць разам з імі танцавальную праходку па сеяным пясочку... Нават вобраз нябожчыцы маці, створаны з такой замілаванасцю, не змог запыніцца ў гэтай хадзе, калі яе гукнуў сын Федэрыка, — хаця б на колькі хвілінак... Не — толькі на імгненні. Маці, няхай сабе з прабачлівай вінаватасцю, але неадпрэчна выбрала карнавальную дзею, імклівы блазненскі карагод. У разгубленасці перасмыкнула плячыма: маўляў, анічога не магу з сабой зрабіць, прабач, ты ж сам усё так зладзіў, сам зрэжысіраваў гэтую захапляльную, бясконцую, як мінулае і як будучыня, дзею, сам, мой неўтаймоўны хлопчык... За расхінутыя ў бакі рукі актрысу падхапілі і павялі за сабой усхваляваныя блізкім фіналам фільма іншыя выканаўцы роляў...

Тут Феліні выяўляецца як зусім неабачлівы разбуральнік канонаў адвечных чалавечых повязяў, як майстра, для якога творчасць калі не вышэй, дык упоравень з існа святым — такім, як маці.

◆◆◆

Згадваю кадры з фільма «Амаркорд». Падлеткі трымаюць споведзь перад святаром. Пажылы чалавек, які добра ведае грахоўную прыроду Адамавых сыноў, раз-пораз пытаецца ў гарачых у нясцерпнай пажадзе жэўжыкаў: «Ты кратаеш сябе? Кратаеш? Я ведаю, ты кратаеш сябе?..» — маючы на ўвазе нікчэмны занятак аблуднага Анана. Не надта каб зніякавелыя ад непрыемнага пытання, зацятыя ў неадпрэчнай корці найхутчэйшай спробы дарослага жыцця, падлеткі вяла аднекваюцца. Яны ж «кратаюць сябе», ды яшчэ як — адзін перад адным, ледзьве не навыперадкі, як сведчыць кінаэпізод у легкавушцы.

А праз колькі хвілін у гэтым фільме мы бачым другі сюжэцік. У кадры — імпрэза, якую ў прыморскім гарадку, дзе жыве наш герой-падлетак, ладзяць мясцовыя фашысты. Іх завадатар, караткаsuccessful ногі, з вялізнымі, нібы напампаванымі грудзьмі карапет, а з ім зграя вымуштраваных паплечнікаў, усё адно як нанятыя антрэпрынёрам блазны падчас парадуале, імкліва выбягаюць на старажытную гарадскую вулічку — але-ап! — пачынаецца фізкультурна-палітычнае відовішча. А першая прыгажуня Градзіска, цыбатая мара ўсіх юнакоў, зашчэмленая цесным натоўпам, крычыць з тратуара ў няўцямным захапленні: «Дайце, дайце мне дакрануцца да яго!» — да фашысцкага карапета і выцягвае над галовамі сяброваk сваю прыгожую доўгую руку.

Хлопцы краталі сябе, Градзіска імкнецца пакратаць фашызм. Ананізм.

Такога вытанчанага, без гукаўзмацняльнай публіцыстычнасці, а, наадварот, лічы, інтымнага абсмяяння фашызму, да Феліні я не сустракаў.

◆◆◆

Здаецца, бясконцы відарысны ланцужок Майстра цесна сашчыльнены, перанітаваны з лірычнай, асацыятыўнай прозай пра асабістае. Плынню гэтай прозы вымываюцца з Боскага радовішча душы залацінкі шчымлівай тугі па незваротна страчаным быцці — па дзяцінстве, юнацтве, маладосці і нават па старасці.

Калі я «сніў» Феліні, дык міжволі згадаў фільм «Люстра» Андрэя Таркоўскага. І там ланцужок кадраў і літаратурная аснова раўнавартасныя. Прыкмета аўтарскага кінематографа.

◆◆◆

Федэрыка Феліні праз Марчэла Мастраяні ў фільме «8 1/2», маючы нагоду, звяртаецца да высокага святара-іерарха: «Я такі няшчасны!..» І раптам нечакана чуе ў адказ: «А чаму вы думаеце, што Госпад стварыў вас для шчасця?» Гэтым пытаннем Божага служкі рэжысёр, вобразна кажучы, павесіў вялізны свірнавы замок на дзвярах несупыннай фабрыкі кіналетуценняў з яе аскомнымі хэпі-эндамі. Сапраўды, хто калі сказаў гэтым тыражным творцам, што Госпад замысліў нас дзеля нашага асабістага шчасця, дзеля ўсцешнага падрахунку ўсіх жыццёвых падзей?

◆◆◆

Як падбор акцёраў на прыродненыя са сваёй душой ролі, так і падбор рэчаў, якія будуць у кадры, рэжысёр старанна робіць праз сіта свайго густу. Усё, што ў кадры, да драбніц, нацэджана ім з рэчаіснасці праз гэтае сіта. Атрымліваецца па-рэжысёрску майстравіта зладжаны, пазнавальны, але здаецца, першаісны, ніколі не бачаны свет — такі ён пераканаўчы, не выпадковы.

У творцаў, асабліва ў скульптараў, якія, зазвычай, лепяць з гліны тое самае, што сваім часам ляпіў Усёмагутны, рана ці позна ўзнікае праблема суадносін з Ім. О, як гэта важна прыдушыць славалюбства, зацугляць фанабэрыю, астудзіць пыху, каб не ўзвысіць сябе ўпоравень з Тым, хто меў дні Стварэння.

У Феліні такой праблемы суадносін не было. Ён проста сёе-тое перастаўляў з выбранага ў абжытым людзьмі свеце, суладна ці, наадварот, супрацьвагава, супярэчліва злучаў, мяняў парадак падзей, чаргаванне настрояў і думак ды ўсё гэта здымаў на плёнку, каб не забыць. Ат, дзіцячыя забаўкі з Божымі стварэннямі ды з іх цацкамі, рыштункам, рознай драбязой. Але ж даволі далікатныя і абачлівыя. Так грашыць не надта апантаны вернік: патрошку і, як дзіця, шчасліва верыць ва ўседаравальную Бацькаву прыхільнасць.

У фінале фільма «81/2» Фіоіні выводзіць усіх дзеючых асоб на толькі што зладжаную здымачную пляцоўку свайго новага, свежа замысленага кінатвора. Мы бачым тут толькі што зладжаныя дэкарацыі — не завершаныя, здаецца, часовыя... Недарэчная металічная спаруда, ні для чаго не прыдатная канструкцыя, хіба толькі для замацавання кінапражэктараў... Гэта нават не дэкарацыі, а такім чынам матэрыялізаваная думка пра іх, спешны чарнавы накід, абрыс уяўленага графічнага вобраза... Каб падкрэсліць: вось бачыце — гэта так, блазнаванне, вырашыў трошкі падурэць ды і толькі, зусім я не збіраюся пад такім высокім небам усчынаць якое галавакружнае стварэнне свайго штучнага свету, мне дастаткова існага, незаменнага...

◆◆◆

Калі я ў чарговы раз прачынаўся, дык пры дапамозе камп'ютарнага «мышаняці» адцягваў слізгунок па яго рэечцы-каляіне на дысплеі назад, каб адшукаць тое месца ў чарадзе кадраў кінастужкі Фіоіні, на якім мяне змарыў сон. З першага разу зазвычай не патрапляў, узнімаўся трохі далей і такім чынам паўторна праглядаў некаторыя эпізоды фантазійнай дзеі. Натуральна, аніяк не атрымлівалася дакладна, кадр у кадр надтачыць працяг прагляду. Вось такі зусім не трапны, у адрозненне ад Федэрыка Феліні, атрымліваўся ў мяне мантаж.

◆◆◆

Аднойчы вытанчаны Федэрыка сваімі кадрамі вымусіў мяне нанова перажыць зімовае прасвятленне душы, якое меў я ў Віцебску ў студэнцкія гады. Познім вечарам, памятаю, блукаў па старым горадзе. Стомлены мінтрэгамі кахання, прыгнечаны глухой адзінотай, нацэлены хоць на якую малую ўцеху, я ўзіраўся ў гарадскія агні ды ў заглыбленых у натапыраныя каўняры людзей. Хацелася ссукаць хаця б якую кароценькую нітку сумоўя. І тут раптам буйнымі шматкамі паляцеў з неба снег. Я быў якраз каля ратушы, у тым месцы, дзе да яе падножжа падбіваецца вулічка Талстога. Зусім кароценькая, яна — на адзін разгублены позірк чалавека, які не ведае, куды ісці. Над вулічкай, акурат пасярэдзіне, на прымацаваных да слупоў драцінах, нібы калыскі начнога святла, віселі бляшаныя плафоны ліхтароў. Лямпачкі сядзелі ў іх так глыбока, што святло абразалася тонкімі краямі схованкі, але яго было дастаткова, каб з бляшаных калысак на вуліцу высяваліся вялікія жоўтыя кругі — асновы светлых конусаў, якія сыходзіліся ўверсе, на лямпачках. Хто бачыў бы гэтыя конусы, каб не шматкі густога снегу!

Кругі шыхтаваліся адзін за адным, не раўнуючы, як у фільме «Амаркорд».

І гэта было задоўга да выхаду ў свет фільма Федэрыка Феліні. І вось цяпер тыя згадкі зманціраваліся ў маёй свядомасці з кадрамі, напоўненымі святлом снегападу, якое Кінамайстра таксама сфармаваў, як мне здаецца, у віцебскія конусы. Мне заманулася хаця б вось так, на дроце памяці, зберагчы тыя ліхтары з вулічкі Талстога, бо наяве іх ужо няма: замянілі на зусім новыя, на звыклых слупах.

Юнацтва маё адгарадзілася цяжкой заслонай сумнай сталасці... Толькі сон ад Федэрыка Феліні я прытуліў пад шчакой на далоньцы, як летуценны юнак.

**Сяргей РУБЛЕЎСКІ**

■



Кадр з фільма «8 1/2».

■ Кватэрнае пытанне

# ЦЯГНІК СЫШОЎ

**У свой час я ніяк не скарысталася сваімі чэкамі «Маёмасць». Хацела цяпер перавесці іх у чэкі «Жыллё» і дапамагчы дачцэ выкупіць дом у саўгасе. Ці можна гэта зрабіць?**

**А.І., Клецкі раён.**

На жаль, не. Бо, па-першае, у адпаведнасці з падп. 1.15 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 г. № 6 «Аб упарадкаванні абарачэння і выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё», пасля 1 студзеня 2006 г. знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё». Перарэгістрацыя чэкаў ажыццяўлялася ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Ашчадны банк «Беларусбанк» да 1 студзеня 2007 г.

Па-другое, у свой час грамадзяне мелі права перааформіць свае імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё» на чэкі «Маёмасць». Адпаведна, і чэкі «Маёмасць» (атрыманыя ў выніку абмену чэкаў «Жыллё» на чэкі «Маёмасць») можна было перааформіць у вызначаным парадку на чэкі «Жыллё» і выкарыстаць як на прыватызацыю жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, так і на рэканструкцыю аднакватэрных блакіраваных жылых дамоў.

Названыя абменныя аперацыі ажыццяўляліся таксама да 1 студзеня 2007 г.

# ВЫСЕЛІЦЬ МОГУЦЬ... ПАСЯЛІЦЬ — АБАВЯЗАНЫ

**Восем гадоў таму па месцы працы мне выдзелілі службовую кватэру. Па-ранейшаму жыву ў ёй, збіраюся на заслужаны адпачынак. Аднак сыходзіць баюся, бо чуў, што згодна з новым Жыллёвым кодэксам мяне тады могуць выселіць са службовага жылля. Ці так гэта?**

**Л. П., г. Мінск.**

Згодна з п. 7 арт. 118 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, дагавор найму службовага жылога памяшкання дзяржжылфонду з'яўляецца тэрміновым і ў сувязі са стратай падстаў для пражывання ў ім падлягае спыненню альбо скасаванню. Прычым у выпадку адмовы былога працаўніка вызваліць службовае жыллё ён падлягае высяленню разам з усімі грамадзянамі, якія пражывалі сумесна, у судовым парадку без выдзялення іншай жылплошчы.

Разам з тым, п. 3 арт. 221 ЖК прадугледжана, што са службовага жылога памяшкання, выдзеленага да 8.04.2006 г., без выдзялення іншага жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцяў не могуць быць выселены, у прыватнасці, наймальнікі:

якія адпрацавалі не менш як 10 гадоў у арганізацыі, якая выдзеліла службовае жылое памяшканне (незалежна ад яго прыналежнасці);

якія звольнены ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі альбо па скарачэнні колькасці або штату працаўнікоў;

якія маюць права на працоўную пенсію па ўзросце (у тым ліку на льготных умовах) і за выслугу гадоў.

Гэта значыць, што супрацоўнік арганізацыі, які сышоў на заслужаны адпачынак, у вызначаным парадку можа быць выселены са службовай кватэры, але з выдзяленнем іншага жылога памяшкання.

# ЯК СТВАРЫЦЬ ЖБК?

**Я працую ў бюджэтнай арганізацыі і ў ёй жа стаю ў чарзе на жыллё. На льготны крэдыт разлічваць не магу, бо жыву па дагаворы найму ўсяго тры гады. Падкажыце, як мне вырашыць сваё жыллёвае пытанне? Ці будуць цяпер ствараца жыллёва-будаўнічыя кааператывы ў бюджэтных арганізацыях?**

**С. Кур'яновіч, г. Слуцк.**

Грамадзяне, якія знаходзяцца на кватэрным уліку і не маюць права на крэдыт на льготных умовах, могуць атрымаць яго на агульных — у Беларусбанку, Белінвестбанку, Белаграпрамбанку і інш. Умовы крэдытавання перыядычна мяняюцца, таму аб дзейных (на дату звароту ў банк) можна даведацца ў адпаведных філіялах. Напрыклад, Беларусбанк з 17 чэрвеня 2013 г. крэдытуе так званых чаргавікоў, у памеры да 75% кошту будаўніцтва (рэканструкцыі) жылога памяшкання (у межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка), на тэрмін да 20 гадоў і пад 16 % гадавых (грамадзянам, якія пастаянна пражываюць і працуюць, будуюць, рэканструююць і набываюць жылыя памяшканні ў сельскіх населеных пунктах, — пад 14% гадавых).

Што датычыцца ЖБК, то парадак іх стварэння вызначаны арт. 181 і 182 ЖК. У прыватнасці, для фарміравання арганізацыі забудоўшчыкаў з ліку чаргавікоў дзяржаўныя арганізацыі, гаспадарчыя таварыствы пры наяўнасці зямельнага ўчастка для будаўніцтва аб'ектаў нерухомай маёмасці, або недабудаванага аб'екта нерухомай маёмасці, або аб'екта нерухомай маёмасці, які падлягае капітальнаму рамонту або рэканструкцыі альбо продажу, вызначаюць агульную колькасць яе членаў і пісьмова паведамляюць аб фарміраванні арганізацыі забудоўшчыкаў грамадзян, якія знаходзяцца на кватэрным уліку ў адпаведнасці з чарговасцю іх пастаноўкі на такі ўлік.

У выпадку фарміравання арганізацыі па месцы працы (службы) у дзяржаўнай арганізацыі, гаспадарчым таварыстве, у яе склад па-за чаргой могуць уключацца асобныя катэгорыі працаўнікоў, якія знаходзяцца ў гэтай дзяржаўнай арганізацыі, гаспадарчым таварыстве на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, вызначаныя калектыўным дагаворам (пагадненнем), а пры адсутнасці калектыўнага дагавора (пагаднення) — рашэннем адміністрацыі дзяржаўнай арганізацыі, гаспадарчага таварыства і прафсаюзнага камітэта (пры яго наяўнасці). Пералік катэгорый працаўнікоў, якія па-за чаргой могуць быць уключаны ў арганізацыю забудоўшчыкаў, павінен быць узгоднены з вышэйшым дзяржаўным органам, вышэйшай арганізацыяй, а колькасць працаўнікоў з ліку гэтых катэгорый у арганізацыі забудоўшчыкаў не павінна перавышаць 20%.

Неабходна таксама адзначыць, што графікі будаўніцтва (рэканструкцыі) і фінансавання канкрэтных жылых дамоў у аб'ёмах (штогод вызначаюцца пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь) зацвярджаюцца аблвыканкамам і Мінскім гарвыканкамам па ўзгадненні з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва.

**Віктар САВІЦКІ**

■

■ Нам пішуць

# «ДАЗВОЛЬЦЕ ПРАЦАВАЦЬ І АДНАЧАСОВА ДАГЛЯДАЦЬ ПЕНСІЯНЕРАЎ»

**У рэдакцыю «Звязды» прыйшоў ліст ад Дзігалёва Мікалая Іванавіча з Бабруйска. Чытач не задаволены прыняццем дакументаў аб шматдзетных маці і інвалідах. «Я сам са шматдзетнай сям'і, таму выступаю за тое, каб маці, якая нараджала ў СССР, мела такія ж правы, што і сучасная. Маю на ўвазе прысваенне шматдзетным жанчынам дзяржаўных узнагарод і пенсій за асаблівыя заслугі. Ураўнуйце іх у правах, і дэмаграфічнае пытанне вырашыцца». Тут жа ён скардзіцца на тое, што «маці, якая нарадзіла дзіця ў Бабруйску, у адрозненні ад мінскіх маці, не мае права бясплатна атрымліваць памперсы». Таксама Мікалай Іванавіч просіць дазволіць людзям, якія абслугоўваюць інваліда 1 групы, альбо пенсіянера, якому больш за 80 гадоў, працаваць па сумяшчальніцтве. «За догляд плацяць невялікую дапамогу, на якую нерэальна пражыць аднаму, не кажучы ўжо пра сям'ю. Таму чалавек вымушаны ісці падпрацоўваць нелегальна...».**

**З лістом азнаёміўся намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.** Ён патлумачыў, што пенсія за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь можа быць устаноўлена: «жанчынам, якія нарадзілі і выхавалі **дзевяць** і больш дзяцей і ўзнагароджаным адной з наступных дзяржаўных узнагарод СССР ці Рэспублікі Беларусь: ордэнам Маці, «Медалём мацярынства», ордэнам «Мацярынская слава», ордэнам «Маці-гераіня», згодна з пунктам 3 Палажэння аб пенсіях за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў ад 30 сакавіка 1993 года №185 (у рэдакцыі пастановы Савета Міністраў ад 13 кастрычніка 2011 года №1367).

У Савецкім Саюзе была прадугледжана сістэма ўзнагароджвання жанчын за шматдзетнасць і выхаванне дзяцей. Яна ўключала медалі «Медаль мацярынства» II і I ступеняў, якімі жанчыны ўзнагароджваліся за нараджэнне пяці і шасці дзяцей адпаведна, ордэн «Мацярынская слава» трох ступеняў за нараджэнне і выхаванне сямі, васьмі і дзевяці дзяцей і ордэн «Маці-гераіня» для ўзнагароджвання маці за нараджэнне і выхаванне дзесяці дзяцей. **У Рэспубліцы Беларусь устаноўлены толькі ордэн Маці, якім жанчыны ўзнагароджваюцца за нараджэнне і выхаванне пяці дзяцей.**

— Рэдакцыя Палажэння, якая дзейнічала раней, прадугледжвала ўстанаўленне пенсіі за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь толькі ўзнагароджаным трыма і больш ордэнамі Рэспублікі Беларусь і(ці) СССР, — працягвае Валерый Кавалькоў. — Гэта паставіла ў няроўныя ўмовы жанчын, якія нарадзілі **дзевяць і больш дзяцей** у перыяд існавання СССР і ўзнагароджаных за гэта трыма-чатырма ордэнамі, і жанчын, якія нарадзілі **такую ж колькасць дзяцей** ужо ў сучасны перыяд Рэспублікі Беларусь і ўзнагароджаных за гэта толькі адным ордэнам. Каб забяспечыць роўныя ўмовы для прадастаўлення шматдзетным маці права на пенсію за асаблівыя заслугі ўнесены дапаўненні, якія ўраўноўваюць у правах маці, што нарадзілі і выхавалі аднолькавую колькасць дзяцей, незалежна ад колькасці ўзнагарод, якія ў іх маюцца за шматдзетнасць. У такім выпадку галоўная заслуга жанчыны — гэта годнае выхаванне сваіх дзяцей і ўласная бездакорная рэпутацыя як маці. Калі ёсць звесткі, што сям'я няўдалая, аблвыканкамам (Мінскаму гарвыканкаму) рэкамендавана не прадстаўляць жанчыну да ўстанаўлення пенсіі за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь.

Калі гаварыць пра бясплатнае атрыманне памперсаў, то раней у Мінску са сродкаў мясцовага бюджэту давалася штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 1 года (у памеры розніцы паміж бюджэтам пражытковага мінімуму і памерам дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў). З 1 студзеня 2010 года такія выплаты не рабіліся ў сувязі з тым, што памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў павялічыўся да бюджэту пражытковага мінімуму.

— А з улікам таго, што з 1 студзеня 2013 года дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў узраслі яшчэ больш істотна, пытанне аб прадастаўленні дадатковых выплат сем'ям з малалетнімі дзецьмі са сродкаў мясцовых бюджэтаў не разглядаецца, — падкрэсліў намеснік міністра. — Што тычыцца дапамогі па доглядзе інваліда 1 групы або пенсіянера, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту і мае патрэбу ў пастаянным доглядзе, то мэта такой дапамогі — даць працаздольным асобам, вымушаным пакінуць працу з-за неабходнасці пастаяннага догляду непрацаздольнага грамадзяніна, сродкі для існавання. Працуючыя асобы ў вольны ад працы час маюць права займацца любой справай, у тым ліку доглядам дзяцей, непрацаздольных членаў сям'і і г.д, што не можа быць на платнай аснове. Цяпер рыхтуюцца прапановы аб узмацненні патрабаванняў да прэтэндэнтаў на атрыманне ўказанай дапамогі, бо ўсё часцей сталі з'яўляцца выпадкі адкрытай меркантыльнасці пры выкананні сямейных абавязкаў.

**Надзея ДРЫЛА**

■

# «АДДАЦЬ ШВАРТОВЫ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ВУЧЫЦЦА РАТАВАЦЬ ТРЭБА ПАСТАЯННА

Штодня ў ратаўнікоў па графіку стаяць камандныя трэніроўкі. Адна з іх — «пошук манекена ў вадзе». Як толькі гэты прадмет аказаўся за бортам, даецца спецыяльны сігнал. Катар павінен адысці ад пірса па трывозе за трыццаць секунд і праплыць семсот метраў да месца падзення. А вадалазам трэба максімум за паўтары хвіліны знайсці манекен пад вадой. І пасля ўжо пачынае працаваць медсястра. Асобна ж ратаўнікі адпрацоўваюць навыкі хуткаснага ваджэння, кідання круга і, вядома ж, плавання.

Вучаць ратаўнікоў і навыкам правільнай буксіроўкі манекена. Гэта робіцца для таго, каб тапелец у паніцы незнарок не пацягнуў разам за сабой на дно і ратаўніка. Навука складаная — трэба навучыцца правільна рабіць захоп.

Стаць пад сцяг таварыства ратавання на водах няпроста. Кандыдат павінен быць даволі дужым як фізічна, так і псіхалагічна. Уявіце сабе: вадалаз, які працуе ў адзіночку, сутыкнуўся недзе на глыбіні ў чатыры метры, дзе бачнасць блізкая да нулявой, з чалавекам. І яго трэба праз тоўшчу вады цягнуць за сабой, паднімаць наверх.



Вадалазы Аляксандр Касцюк і Віктар Жвірбля праводзяць трэніровачныя пагружэнні.

## «ХЛОПЦЫ, ВЫ Ж ПРОСТА НАПЛЯВАЛІ НА ТЭХНІКУ БЯСПЕКІ!»

Працоўная змена ў ратаўнікоў стартуе ў 10 гадзін раніцы і доўжыцца да захаду сонца. Гадзіна «Х» пачынаецца, калі ртутны слупок тэрмометра падпаўзе да адзнакі ў дваццаць пяць — трыццаць градусаў. Тады на вадасховішчы няма дзе яблыку ўпасці. Каманда «Аддаць швартовы!» гучыць пры такім раскладзе для ратавальнай станцыі ледзь не кожныя паўгадзіны. Экіпаж, які складаецца з матарыста, дзяжурнай медсястры і двух вадалазаў, адпраўляецца калі не ў «баявы», то ў прафілактычны рэйс папярэдзіць занадта самадзейных купальшчыкаў. Працуюць змены па графіку «два дні праз два».

Мы выходзім у рэйд па зоне вадасховішча, якая не ахоўваецца. Першы парушальнік трапіўся літаральна праз хвіліну. Малады чалавек рассякаў ваду, пакінуўшы буйкі далёка ззаду.

— Гэй! Паварочвай да берага, гэта сярэдзіна вадасховішча! Ці даплывеш? — крычыць купальшчыку вадалаз Аляксандр Касцюк.

— Народу каля берага шмат. І брудна там. І мелка занадта, — ліхаманкава спрабуе знайсці адгаворку незадачлівы купальшчык.

— І што з таго? А калі, крый Божа, здарыцца што? Тут глыбіня метраў шэсць, — не адстае ратаўнік.

Гэтыя аргументы ўраз пераканалі купальшчыка і ён павярнуў да берага. А мы плывём далей. На надзьмутым матрацы — хлопец з дзяўчынай. Хаця на ім плаваць катэгарычна забаронена — можна толькі загараць.

— Да берага давайце! Нельга плаваць на матрацы. Можаце перакуліцца, а тут глыбока, — ушчувае пару праз мегафон вадалаз. Нічога не адказаўшы, хлапец развярнуў матрац і паплыў назад.

На зваротным шляху матарыст скіроўвае катар да перагружанага катамарана. Хоць гэты плыт і разлічаны на чатырох чалавек, але гэта не перашкодзіла ўскараскацца туды і пятаму. Няўзброеным вокам відаць, што катамаран прасеў пад залішнім цяжарам.

— Хлопцы, вы ж проста наплявалі на тэхніку бяспекі! Калі заказвалі катамаран, вам жа растлумачылі, што на ім могуць катацца не больш за чатыры чалавекі. А вы што робіце?

Сярод парушальнікаў сустракаюцца і сапраўдныя кулібіны. Чаго яны не вынаходзяць, каб заплыць як мага далей ад берага! Людзей здымалі і са старых дзвярэй, і з драўляных катушак ад кабелю. І хоць на пляжы ўсталяваны стэнд, дзе напісана, што забараняецца плаваць на самаробных плытах, спыняе гэта не ўсіх. Гадоў восем таму ратаўнікі ўбачылі, як падлетак трымаецца на вадзе, нібы качка. Падышлі на катары бліжэй і ўбачылі, што хлопец плыў на... звязаных паміж сабой пластыкавых бутэльках. І прасунуўся ж далёка — школьніка знялі ўжо недзе праз метраў сто ад берага. У яго спыталі: «Ты хоць думаў, што магло б быць, калі б бутэлькі развязаліся?» А ў адказ была цішыня...

На жаль, дзеці тонуць і з-за неахайнасці дарослых. Мінулым летам у канале, які падыходзіць да гарадской забудовы, захлынуўся малы. Ціхенька адышоў, паслізнуўся, упаў — і ўсё. І ніхто нават не заўважыў, што хлопчык знік...



Матросы пастаянна сочаць за парадкам на вадзе.

**Аднойчы ратаўнікі ўбачылі, як падлетак трымаецца на вадзе, нібы качка. Падышлі на катары бліжэй і ўбачылі, што хлопец плыў на... звязаных паміж сабой пластыкавых бутэльках.**

## «КАМПАНІЯ ПАЧАЛА ПІЦЬ ЗА ЎПАКОЙ ДУШЫ ТАПЕЛЬЦА...»

На малалетніх парушальнікаў яшчэ могуць падзейнічаць і простыя ўшчуванні. Куды цяжэй з тымі, хто не ўяўляе сабе адпачынку без пары бутэлек спіртнога. Кульнуў келіх, другі — і хочацца астудзіцца ў вадзе. Няўмольная статыстыка сведчыць, што ў мінулыя гады тры з кожных чатырох патануўшых былі ў нецвярозым стане.

— На доўгім прафесійным веку, правёўшы пад вадой 7 тысяч гадзін і выцягнуўшы не адзін дзясятак людзей, я пабачыў шмат чаго. Але не магу ўспамінаць без дрыжыкаў некалькі эпізодаў. Адзін урэзаўся ў памяць больш за ўсіх. Кампанія маладых людзей адзначала нейкае свята. Адзін з іх вырашыў пакупацца. Нырнуў — і не выплыў. Пакуль да нас паступіў сігнал, прайшло недзе з паўгадзіны. Вядома ж, выцягнулі мы ўжо труп. А кампанія пачала піць... за ўпакой душы тапельца, — узгадвае начальнік станцыі. — Гэта было так агідна бачыць!



Рулявы матарыст Уладзімір Кандрашоў і вадалаз Аляксандр Касцюк падчас прафілактычнага рэйда.

Зрэшты, у апошні час п'янства на Цнянцы пачало паціху згасаць. Асабліва сёлета, калі з вытворчасці знялі так званае «чарніла». Сваю лепту ўнеслі і штрафы за прылюднае распіццё спіртных напояў — дваццаць супрацоўнікаў міліцыі ўвесь час сочаць за парадкам на тэрыторыі вакол вадасховішча. Ды і мы самі стараемся перадаваць выцягнутых з вады п'янчуг у рукі праваахоўнікаў. Хоць і чуем пры гэтым ад выратаваных увесь набор існуючай нецэнзурнай лексікі.

Аднойчы выратавалі дзяўчыну, якая за сорак метраў ад берага заблыталася ў траве. Там і неглыбока было — прыкладна метр восемдзесят. А мы заўважылі, што нейкі чалавек падскоквае ў вадзе, нібы спружына. Дзяўчына была настолькі п'яная, што нават не ведала, дзе знаходзілася.

Раней дадавалі значнага клопату аматары падлёднай рыбалкі. Аднаго такога небараку мы выцягвалі некалькі разоў. Спачатку думалі, што гэта простае супадзенне. Апошні раз ён праваліўся літаральна на нашых вачах. Тут жа хутка зрэагавалі, дасталі яго, выклікалі «хуткую». Урачы дыягнаставалі невялікае пераахаладжэнне арганізма. Калі небарака ачомаўся, я спытаў у яго: «Не надакучыла рэгулярна тануць?» А ў адказ пачуў наступны перл: «Разумееш, я вось кожны год тану, і ўсё роўна мне хочацца выходзіць увесну на лёд». Хаця ў параўнанні з тым, што было гадоў дзесяць таму, рыбакі сталі даволі свядомымі. Раней жа як было? Ратаўнікі разам з міліцыянерамі едуць ганяць рыбакоў. Тыя бачаць, што да берага пад'язджае машына, і гуськом ідуць у лес. Толькі машына ад'ехала — яны гуськом назад. Звонку гэта выглядала даволі трагікамічна. Але цяпер рыбакі сталі куды больш дысцыплінаванымі. Мабыць, іх пыл астуджаюць магчымыя высокія штрафы ад рыбнагляду.

## НА БРАВАДУ ЛЕПШ ЗАБЫЦЦА

— З любога супрацоўніка таварыства ратавання на водах атрымаўся б першакласны агітатар, — жартуе вадалаз трэцяга класа Віктар Жвірбля. — На прафілактычных выездах наш мегафон сціхае хіба толькі ў пахмурныя ці халодныя дні. Часцей за ўсё робім вымовы людзям, якія плывуць на матрацах ці ўвогуле скачуць у ваду з моста. Апошнія зусім не задумваюцца аб тым, што на дне іх можа чакаць вельмі непрыемны «сюрпрыз» — хаця б тое ж затанулае бервяно ці металічная канструкцыя. Вада не паспявае затармазіць хуткасць вольнага падзення, і чалавек ламае сабе пазванкі. У лепшым выпадку ён становіцца інвалідам... Ужо нават і адмысловы выратавальны пост там паставілі, каб толькі людзі не рызыкавалі жыццём з-за бравады.

Віктар — майстар спорту. Ён працуе на «Цнянскай» ужо больш за пяць гадоў. За гэты час выратаваў жыцці дзясяткам людзей. Але дагэтуль з яго памяці не сыходзіць недарэчная смерць на вадзе, нявольным сведкам якой ён стаў, ледзь уладкаваўшыся вадалазам.

На мінскім вадасховішчы Драздзы Віктар рыхтаваўся да спаборніцтваў па ратавальным шматбор'і. Заадно, каб не губляць часу, папрасіўся з тамтэйшымі вадалазамі ў рэйс. Было спякотна, і камусьці прыйшла ў галаву ідэя скакаць з дамбы побач з моцным вадзяным вірам. Хлопчыка гадоў дванаццаці так і зацягнула пад шлюз. Шукалі яго ратаўнікі доўга: працу ўскладняў вельмі моцны вадаспад. Не кожны дарослы там зможа выплыць. У гэты дзень усіх ныральшчыкаў са шлюза нібы ветрам здзьмула. Ды ненадоўга: ужо назаўтра дарослыя экстрэмалы зноў рызыкавалі там жыццём.

⬥⬥⬥

На Цнянскім вадасховішчы рэгулярна працуюць шаснаццаць супрацоўнікаў таварыства. Улетку туды дадаткова ўладкоўваюцца дзесяць матросаў. Зусім хутка яны пераедуць у новы вялікі сучасны будынак выратавальнай станцыі. Плануецца, што ён будзе ўзведзены ўжо да канца наступнага года. Вось каб яшчэ купальшчыкі зразумелі, што ратаўнікі таксама не ўсёмагутныя, нягледзячы нават на сучаснае высокатэхналагічнае абсталяванне...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

# «СВЯТА» Ў ПАДАРУНАК

**Новасібірскі Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр імя Еўфрасінні Полацкай адправіў у падарунак мінчанам ансамбль беларускай песні.**

Сяброўства паміж гарадамі-пабрацімамі Мінскам і Новасібірскам мацнее. Так, на пачатку тыдня 120-годдзе Новасібірска разам з сібіракамі адзначыла беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска Аляксеем Каштальянам. Цяпер жа ў беларускай сталіцы з дабрачыннымі гастролямі знаходзіцца ансамбль беларускай песні Новасібірскага каледжа культуры і мастацтваў «Свята».

Пасля выступлення ў парку Чалюскінцаў да сібірачак падыходзілі беларусы і дзякавалі. Дзякавалі за тое, што прыехалі здалёк, за цудоўны голас і моцную станоўчую энергетыку. Асабіста ж мяне вельмі парадавала, калі Юлія Смірнова, кіраўнік ансамбля, папрасіла: «Гаварыце са мной па-беларуску. Я вас разумею. А калі нейкае слова не зразумею, то перапытаю! Беларуская мова вельмі лірычная. Калі мне прапанавалі ўзначаліць ансамбль, беларускі альбо ўкраінскі, не раздумваючы, выбрала беларускі. Перш за ўсё з-за мовы».

— Назваць ансамбль «Святам» мне ў свой час параіла Людміла Шчаслівенка, намеснік дырэктара па культуры нашага Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра, — адказвае на маё пытанне Юля. — Гэта ідэя мне адразу спадабалася. «Свята» і»свята» — гэтыя два паняцці мне вельмі блізкія. Свята, як я кажу, справа святая. Імкнёмся несці ў народ беларускую культуру, настрой, духоўнасць.



Беларускія сакрэты ад Ларысы Мятлеўскай пераймае сібірачка Юлія Смірнова.

У Мінску Юля Смірнова пазнаёмілася з вядучай праграмы «Беларуская кухня» Ларысай Мятлеўскай.

— Я не магла прапусціць гэтую жанчыну, — усміхаецца Юля. — Бачу, чалавек у беларускі традыцыйны строй апрануты. У нас жа строі стылізаваныя. Ларыса, як высветлілася, этнограф, паспела расказаць мне пра беларускія ўзоры, сукенкі, галаўныя ўборы. Нам усё гэта цікава. Этнаграфія — наша кухня. Я вельмі рада, што мы абмяняліся кантактамі.

— Калектыў, які мы прывезлі ў Беларусь, гэта нашы рускія дзяўчаты, сібірачкі, але карані ў многіх з іх беларускія, — падключаецца да размовы **дырэктар Новасібірскага абласнога каледжа культуры і мастацтваў Аляксандр ІВАНОЎ**. — Цяга да беларускай культуры і традыцый у моладзі Сібіры вялікая. І ніхто яе не спыніць: ні палітыкі, ні мудрыя эканамісты... Радуюся, калі чую ў Расіі беларускую песню, у Беларусі — рускую. Мы — славянскія народы, з блізкімі культурамі, павінны паказваць прыклад сяброўства для ўсяго свету. Разам мы сіла. Мы будзем у Беларусі да канца тыдня. За гэты час наведаем беларускую Акадэмія мастацтваў, Мінскі каледж мастацтваў. Спадзяюся, усталюем творчыя прафесійныя масты, якія дазволяць нашым студэнтам вучыцца ў вас, а вашым — у нас.

Вясной Новасібірск з дабрачыннымі гастролямі наведаў беларускі ансамбль цымбалістаў «Першацвет», цяпер у Мінск прыляцела новасібірскае «Свята».

— Падобныя культурныя абмены, безумоўна, спрыяюць умацаванню сяброўства гарадоў-пабрацімаў, — лічыць **вядучы спецыяліст упраўлення ідэалагічнай работы, фізкультуры і па справах моладзі адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска Наталля КАРАЛЁВА.** — А ўзровень культуры, не сакрэт, вызначае і ўзровень эканомікі. Як важна, калі мы гаворым пра эканомію, выгоды, працэнты, быць шчырым, адкрытым душой. Вось, чуеце, гучыць добрая песня. Яна раскрывае душы, саграваае сэрцы. Хочацца адно аднаму сказаць добрыя словы. Кожны з нас выйграе, калі мы будзем багацейшыя ў плане культуры.

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

## ЧАС ШУКАЦЬ ПАПАРАЦЬ-КВЕТКУ

Хто не марыў знайсці папараць-кветку? Штогод у ліпені яна вабіць нас, хаваецца на святаянскім досвітку і зноў знікае...

Сябру нашай газеты, **пісьменніку Анатолю Бутэвічу** пашчасціла: ён упільнаваў на ліпеньскім фотапаляванні кветку папараці і даслаў у рэдакцыю ўнікальны фотаздымак. Праўда, ён адразу ж удакладніў, што гэтая таямнічая прыгажосць на самой справе — звычайны лубін, які нейкім чынам «пасяліўся» сярод лістоў папараці і нядрэнна там сябе адчувае. Але фотатрафей Анатоля Бутэвіча прыйшоўся вельмі да часу. Гледзячы на здымак, можна зрабіць выснову, што, па сутнасці, усё цудоўнае — вельмі звычайнае. Трэба толькі, каб лёс звёў гэта звычайнае разам, і тады — вось яна ваша папараць-кветка. Ад сябе хачу дадаць верш, які таксама заклікае шукаць цудоўнае ў жыцці.



*Мне дзед казаў: «Шукай, хлапеча, кветку.*
*Ідзі з каханай у маўклівы гай.*
*Не знойдзеш ты — калісьці знойдуць дзеткі...*
*Усюды, скрозь — шукай яе, шукай».*
*І я шукаў. У ліпені, у снежні,*
*На непагадзь увагі не звяртаў,*
*У цёмнай пушчы, ля крыніц усцешных...*
*Ці я знайшоў — нікому не казаў.*
*Адно хачу — перад заслонай веку*
*Свайму унуку словы перадаць:*
*«Ну што, хлапеча, час ісці па кветку!*
*Усюды, скрозь — ідзі яе шукаць».*

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

■ ІТ-прагрэс

## Мабільнік — вартаўнік маёмасці

**Кампанія МТС першай сярод мабільных аператараў прапанавала кліентам унікальную воблачную паслугу «Відэаназіранне», якая дазваляе без выкарыстання складанай інфраструктуры арганізаваць відэакантроль на адлегласці.**

Прагляд відэа можна ажыццяўляць як у рэжыме рэальнага часу, так і ў рэжыме запісу. Відэа з гукам можна праглядаць з планшэта, смартфона або экрана камп'ютара. Усё, што патрабуецца для карыстання паслугай, — гэта доступ у інтэрнэт. Каб скарыстацца воблачнай паслугай «Відэаназіранне», неабходна зарэгістравацца на сайце camera.mts.by, устанавіць адну ці некалькі IT-камер з падключэннем да інтэрнэту і актывізаваць на сайце адпаведную паслугу. Кошт анлайн-прагляду без архівіравання запісу складае для фізічных асоб 1600 рублёў у суткі, а з запісам у «воблачны архіў» — 3 200 рублёў у суткі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Прытрымліваючыся стратэгіі супрацоўніцтва з усімі, хто толькі можа аказацца карысным, вы дамажацеся некаторага поспеху няхай прамежкавага, але таксама значнага. Будзеце сустракацца з патрэбнымі людзьмі і зможаце даведацца шмат цікавага і карыснага для сябе. Актыўна спраўляючыся з праблемамі навакольных, не забывайце пра рашэнне сваіх пытанняў.

**ЦЯЛЕЦ.** Будзеце ўдачлівымі як ніколі. Нават калі каму-небудзь прыйдзе ў галаву перашкодзіць вам у бліскучых распачынаннях — нічога не выйдзе: высілкі па дыскрэдытацыі толькі падвояць вашу папулярнасць. Могуць паўстаць праблемы, звязаныя з вострым недахопам часу. Толькі не спрабуйце эканоміць час на працэсе абдумвання, не прымайце паспешных рашэнняў, каб потым не шкадаваць пра іх.

**БЛІЗНЯТЫ.** Будзеце паспяховымі ў шматлікіх сферах жыцця. Многае паспееце зрабіць і нават атрымаеце вялікі плён, адчуўшы карысць і маральнае задавальненне ад бізнесу. Пачняце заваёўваць лідарскія пазіцыі. У сярэдзіне тыдня магчымы прыезд сваякоў, сяброў ці дзелавых партнёраў і клопаты, з гэтым візітам звязаныя. Могуць узнікнуць некаторыя ўскладненні ў адносінах з блізкімі сваякамі.

**РАК.** Тыдзень падрыхтаваў цікавыя перспектывы і шматабяцальныя прапановы, якія можна рэалізаваць дзякуючы дзелавой актыўнасці. Пажадана суадносіць планы з рэальнай сітуацыяй і рабіць іх своечасовую карэкціроўку. Падумайце пра змену спосабу заробку ці хоць бы пра змену пасады.

**ЛЕЎ.** Самае важнае — засяроджанасць і ўменне аказвацца ў патрэбным месцы ў патрэбны час. Не будзе лішнім здольнасць хутка перасоўвацца. Амаль усе справы будуць паспяховымі. Паспрабуйце вырашаць праблемы па меры паступлення. Будзьце ўпэўненымі ва ўласных сілах, каб разабрацца з цяжкасцямі на працы.

**ДЗЕВА.** Рашучасць і актыўнасць дазволяць ажыццявіцца большай частцы планаў і задум. Адна з самых важных задач — наладжванне партнёрскіх адносін і дзелавых сувязяў. Запалу і энергіі хопіць падтрымліваць і каардынаваць дзеянні калег. Важна правільна выбудаваць узаемаадносіны з начальствам. Паспрабуйце не планаваць нічога сур'ёзнага на сераду, гэты дзень пройдзе пад знакам легкадумнасці.

**ШАЛІ.** Вы поўныя сіл і рашучасці. Нястрымнае імкненне наперад дазволіць змесці на сваім шляху ўсе перашкоды. Будуць паспяховымі практычна ўсе справы, за што б вы ні браліся. Некаторыя цяжкасці, якія ўзнікнуць на пачатку тыдня, не стануць перашкодай для праявы прафесіяналізму, але вось над уласнай упартасцю давядзецца папрацаваць.

**СКАРПІЁН.** Жыццёвы поспех будзе залежаць ад агульнай упэўненасці ў тым, што ўсё ідзе добра. Толькі ўявіце, які ў вас наперадзе выдатны адпачынак, поўны прыемных нечаканасцяў, і ваш настрой абавязкова палепшыцца. Не імкніцеся ўсё спланаваць загадзя. Няхай усё ідзе так, як звычайна: у выніку адпачынак стане сапраўды чароўным. Больш часу прысвячайце сям'і і дзецям. Асабліва гэта датычыцца выхадных.

**СТРАЛЕЦ.** Неабходна назапасіцца вытрымкай і цярпеннем. У першую чаргу спатрэбіцца сабранасць і добрасумленнасць. Аддаючы многае, можна чакаць, што і наўзамен вы многае атрымаеце. Паспрабуйце не адмаўляць у дапамозе, калі вы ў сілах дапамагчы. А вось дрэнны настрой, калі ён акажацца такім, лепш трымаць на аброці, каб пазбегнуць непатрэбных праблем. Найбольш спрыяльны дзень — серада, неспрыяльны — пятніца.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні будзьце больш асцярожнымі ў словах: балбатун — знаходка не толькі для абстрактнага шпіёна, але і для нядобразычліўца. Не варта нікому выдаваць сакрэтную інфармацыю. У аўторак з'явіцца магчымасць апярэдзіць канкурэнтаў. Толькі паспрабуйце абысціся без выкарыстання забароненых прыёмаў.

**ВАДАЛЕЙ.** У першай палове тыдня будзьце асцярожнымі ў дзеяннях і праяве свайго стаўлення да некаторых лікаў. Магчымыя канфліктныя сітуацыі на працы. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі, і вы апынецеся ў патрэбны час у патрэбным месцы. Паспрабуйце пачакаць з далёкімі паездкамі да нядзелі, бо яны не апраўдаюць вашых чаканняў. Магчымы важкі прыбытак ад сумеснага бізнесу з энергічнымі партнёрамі. Аднак ад рызыкоўных праектаў з важкай доляй авантурызму лепш адмовіцца.

**РЫБЫ.** Вам могуць прапанаваць справу (перспектыўную толькі на першы погляд), у якую неабходна ўкласці пэўныя рэсурсы. Не спяшайцеся прыняць гэтую прапанову: варта ўсё добра абдумаць. Пачынаючы з аўторка, сітуацыя зменіцца і дазволіць здзейсніць рывок у справах. Не варта спрабаваць вырашаць некалькі важных спраў адначасова. Лепш не спяшацца і зрабіць усё якасна, адклаўшы штосьці на потым.

НАВІНЫ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ

### НЕ ЎТРЫМАЛАСЯ АД СПАКУСЫ

**Следчы камітэт па Брэсцкай вобласці распачаў крымінальную справу ў дачыненні да адной з супрацоўніц банка. Працуючы з наяўнымі грашыма, яна патроху іх крала.**

У пачку з купюрамі вялікіх наміналаў сярэдзіну работніца выкладвала з купюр меншай вартасці. І гэтыя своеасаблівыя «лялькі» здавала ў сховішча. Розніцу забірала сабе. Такім чынам, паводле папярэдняй інфармацыі следства, з пачатку 2009 года да мая 2013-га жанчына прысвоіла 1 мільярд 300 мільёнаў рублёў. За крадзеж шляхам злоўжывання службовым становішчам работніку банка пагражае ад 5 да 12 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

**Яна СВЕТАВА.**

### МАЛАКО «НЕ ПАЙШЛО» НА КАРЫСЦЬ...

**Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Партызанскага РУУС сталіцы за крадзеж прадукцыі аднаго з мінскіх малочных заводаў затрымалі 25-гадовага індывідуальнага прадпрымальніка.**

— Малады чалавек займаўся дастаўкай да гандлёвых аб'ектаў прадукцыі гэтага прадпрыемства. Аднойчы ён, прыбыўшы па тавар, вырашыў «узяць» трохі больш, чым звычайна. Пад'ехаўшы да склада, малады чалавек загрузіў частку прадукцыі, пасля чаго накіраваўся да знаёмай кладаўшчыцы. Тая, акрамя ўказанага ў накладной тавару, выдала яму яшчэ 30 скрыняў малака, кефіру, тварагу, смятаны і іншых малочных вырабаў, якія, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, яны збіраліся рэалізаваць, — расказала прэс-сакратар Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Аднак на шляху да бліжэйшага гандлёвага аб'екта, дзе планавалася прадаць «шэры» тавар, машыну з украдзенай прадукцыяй спынілі аператыўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. Сума нанесенай прадпрыемству шкоды склала 41 мільён рублёў. Сваю віну затрыманы прызнаў, у зробленым пакаяўся.

### З АГАРОДА — У РЭАНІМАЦЫЮ

**Няшчасны выпадак адбыўся ў вёсцы Схоліна Маладзечанскага раёна. Тут мужчына атрымаў апёкі 30 працэнтаў цела.**

Гісторыя пачалася банальна: 38-гадовы вясковец вырашыў спаліць смецце на прысядзібным участку. Абліў яго бензінам і паднёс запальнічку... У выніку ўспышкі пароў паліва мужчына атрымаў апёкі другой-трэцяй ступені. У Маладзечанскую цэнтральную раённую бальніцу вяскоўца даставіў яго сябар. Пацярпелага шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне.

### НАСКОЧЫЛІ НА АЎТАПОЕЗД

**Каля дзвюх гадзін ночы паблізу вёскі Заручча на 431-м кіламетры трасы М1 Брэст — граніца Расійскай Федэрацыі адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, у выніку якога загінулі чацвёра чалавек — усе расіяне. Пра аварыю стала вядома ад відавочцы.**

На месцы высветлілася, што вадзіцель легкавіка «Рэно Дастэр» на справіўся з кіраваннем, і ў выніку яго аўтамабіль сутыкнуўся з аўтапоездам «ДАФ». Апошні стаяў на ўзбочыне. Пры сутыкненні кіроўца аўтапоезда не пацярпеў. А работнікам МНС давялося даставаць з легкавіка целы загінулага кіроўцы і трох пасажыраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 25 июля 2013 г. ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН № 07-Сф-13

### по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 22 земельных участка для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в г.Минске:

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | ул.Хмаринская, № 166 по схеме (Советский район) | 500000000008005668 | 0,0914 | 1 068 070 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 2. | ул.Хмаринская, № 167 по схеме (Советский район) | 500000000008005669 | 0,0914 | 1 068 070 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 3. | ул.Хмаринская, № 168 по схеме (Советский район) | 500000000008005670 | 0,0914 | 1 068 070 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 4. | ул.Хмаринская, № 169 по схеме (Советский район) | 500000000008005671 | 0,0914 | 1 068 070 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 5. | ул.Хмаринская, № 170 по схеме (Советский район) | 500000000008005672 | 0,0914 | 1 068 070 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 6. | ул.Хмаринская, № 171 по схеме (Советский район) | 500000000008005673 | 0,0914 | 1 068 070 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 7. | ул.Хмаринская, № 172 по схеме (Советский район) | 500000000008005674 | 0,0914 | 1 068 070 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 8. | ул.Хмаринская, № 173 по схеме (Советский район) | 500000000008005675 | 0,0936 | 1 093 900 500 | 110 000 000 | 7 437 326 |
| 9. | ул.Хмаринская, № 174 по схеме (Советский район) | 500000000008005676 | 0,1006 | 1 175 695 500 | 120 000 000 | 7 437 326 |
| 10. | ул. Ангарская, 213 А (Заводской район) | 500000000002008103 | 0,0564 | 442 985 400 | 45 000 000 | 6 530 359 |
| 11. | ул. Фучика, 7 (Заводской район) | 500000000002007565 | 0,0574 | 453 454 720 | 45 000 000 | 2 134 249 |
| 12. | пер. Грибной, 46/19 (Заводской район) | 500000000002008105 | 0,0477 | 374 645 700 | 38 000 000 | 6 791 106 |
| 13. | проезд Енисейский, 7 (Заводской район) | 500000000002008102 | 0,0478 | 375 460 800 | 38 000 000 | 5 761 190 |
| 14. | ул. Чекалина, 49 (Заводской район) | 500000000002008104 | 0,0440 | 345 602 400 | 35 000 000 | 6 100 140 |
| 15. | земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005469 | 0,0754 | 883 064 750 | 90 000 000 | 2 168 213 |
| 16. | земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005076 | 0,0736 | 861 990 290 | 87 000 000 | 1 864 388 |
| 17. | земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005482 | 0,0733 | 858 469 250 | 86 000 000 | 2 168 213 |
| 18. | земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005372 | 0,0700 | 819 824 110 | 82 000 000 | 1 864 388 |
| 19. | земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005371 | 0,0638 | 747 211 290 | 75 000 000 | 1 864 388 |
| 20. | пер. 1-й Артема, 17 (Заводской район) | 500000000002007983 | 0,0590 | 471 860 520 | 50 000 000 | 4 927 614 |
| 21. | ул. Таежная, 45 (Партизанский район) | 500000000001033858 | 0,0512 | 417 290 750 | 42 000 000 | 5 148 923 |
| 22. | пер. 1-й Зубачева, 12 (Октябрьский район) | 500000000004004874 | 0,0511 | 492 811 260 | 50 000 000 | 4 927 614 |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Земельные участки, расположенные в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, № 3 находятся в водоохранной зоне водных объектов г. Минска, имеют пониженный рельеф местности, высокий уровень залегания грунтовых вод, представлены торфяными почвами. Инженерно-геологические условия территории ограниченно благоприятные для строительства на естественном основании. Осложняющими факторами являются условия поверхностного стока, во влажные периоды года возможно застаивание атмосферных и талых вод в понижениях микрорельефа.

**Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:**

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

**Аукцион состоится 25 июля 2013 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов)**.

**Для участия в аукционе необходимо:** внести задаток (задатки) **не позднее 19 июля 2013 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка - 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 8 июля 2013 г. по 19 июля 2013 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

